Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 ЧЭРВЕНЯ 2017 г. СУБОТА №104 (28468)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Як назваць новыя станцыі метро?

СТАР. 3

Фестываль у гонар Ружанскай славутасці

СТАР. 9



Кругасветная вандроўка Бегуноў

СТАР. 10

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў:

«Нягледзячы на паступовы пераход ад аднапалярнага светаўладкавання да шматпалярнага і руху да рэальнага балансу паміж ключавымі гульцамі на міжнароднай арэне, усталяванне аптымальнага ўзроўню глабальнай стабільнасці па-ранейшаму застаецца пытаннем аддаленай перспектывы. Імкненне шэрагу вядучых сусветных дзяржаў задзейнічаць сілавыя метады ціску, эканамічныя і рэсурсныя перавагі для прасоўвання сваіх інтарэсаў, навязаць уласныя мадэлі развіцця грамадства таксама стварае дадатковыя крыніцы напружанасці. У такой няпростай геапалітычнай сітуацыі асабліве значэнне набывае эканамічная бяспека. Паспяховая эканоміка — гэта не толькі залог дабрабыту нацыі, але і аснова жыццяздольнасці і ўстойлівасці дзяржавы, яе сапраўднай незалежнасці».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 03.06.2017 г.

Долар ЗША	1,8665	▲
Еўра	2,0938	▲
Рас. руб.	0,0329	■
Укр. грыўня	0,0710	▲

ISSN 1990 - 763X

На дзьмухаўцовым пагорку

Вакол вёскі Сабалі Чашніцкага раёна — маляўнічыя пагоркі, з якіх адкрываюцца непаўторныя віды і на азёры, і на само паселішча. Патомны вясковец Уладзімір Ясны заўсёды любуецца гэтымі краявідамі і называе іх не інакш — незвычайнымі. Нават у свае семдзесят восем яго душа па-ранейшаму неспакойная да хараства, якое дорыць прырода.

— Ніколі б не памяняў свае Сабалі на іншае месца, — кажа пенсіянер.

Уладзімір Іосіфавіч — былы калгасны шафёр, болей за дзесяць гадоў працаваў кавалём. У яго добрая сям'я — з жонкай Нэлі Сямёнаўнай выгадавалі чацвёра дзяцей — неблагі дом, дагледжаны сад-агарод. І невялікі статак козачак, якіх ён кожную раніцу пасвіць на дзьмухаўцовым пагорку.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

■ Сам-насам

Мітрапаліт ПАВЕЛ:

«ДОБРАЯ ДУМКА ПРА ЧАЛАВЕКА — УЖО ПРАЯВА ЛЮБОВІ»

За яго спінай служэнне ў многіх краінах — Ізраілі, Злучаных Штатах Амерыкі, Канадзе, Мексіцы, Аўстрыі, Венгрыі. Апошняй у гэтым спісе значыцца Беларусь. Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, вось ужо чацвёрты год нясе служэнне ў нашай краіне. Ён змяніў мітрапаліта Філарэта, на плечы якога яшчэ за савецкім часам лягло адраджэнне Беларускай праваслаўнай царквы. Цяпер уладыка Павел працягвае пачатую ім справу. У размове сам-насам мітрапаліт Павел расказаў пра цуды, якія сустракаліся ў яго жыцці, як марыў стаць лётчыкам, і пра тое, як аднымі светлымі намерамі можна дапамагчы сабе і блізкім.

— Уладыка, на ваш погляд, як праяўляецца духоўнасць у беларусаў?

— Духоўнасць — паняцце ўніверсальнае, яно не прывязана ні да нацыянальнасці, ні да краіны. Ужо ў першыя стагоддзі хрысціянства, у часы ганенняў, язычнікі, абмяркоўваючы публічныя пакаранні смерцю тых, хто адмаўляўся пакланяцца ідалам, дзівячыся і разважаючы паміж сабою, казалі, што з'явіліся нейкія людзі, якія не баяцца смерці. Мясцовых жыхароў здзіўляла тое, што ў гарадах пануе эпідэмія, людзі паміраюць проста на вуліцах, вакол шмат трупаў, а хрысціяне не баяцца смерці. Яны смела ходзяць, збіраюць нябожчыкаў і хаваюць іх.

СТАР. 4-5

■ Размова па сутнасці

БЯСЦЭННЫ ДАР І ВЯЛІКАЯ АДКАЗНАСЦЬ

Колькі ў краіне прэснай вады, чаму батарэйкі сартуюць уручную і як адпачыць, не нашкодзіўшы прыродзе

У апошні час экалогія стала не толькі модным напрамкам, усё большую вагу яна набывае і на дзяржаўным узроўні. Захаванне і прымнажэнне прыродных багацця, паляпшэнне якасці паветра, вады і харчу, развіццё «зялёных» тэхналогій і павелічэнне за іх кошт эканамічнага патэнцыялу нашай краіны — усё гэта і многае іншае ўключае сёння дадзенае паняцце. З улікам аб'яднання эканамічнага, сацыяльнага і экалагічнага аспектаў выбудавана і Нацыянальная стратэгія ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2030 года. Напярэдадні Сусветнага дня навакольнага асяроддзя міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй КАЎХУТА расказаў карэспандэнту «Звязды», што дапамагае зрабіць Беларусь яшчэ больш чыстай і зялёнай.

Залог здароўя — чыстае навакольле

— Андрэй Марленавіч, Дзень навакольнага асяроддзя можна назваць зыходным пунктам для вызначэння прыярытэтных напрамкаў дзейнасці Мінпрыроды на кожны год. Якія праблемы і тэмы актуальныя для міністэрства ў 2017-м?

— За мінулыя гады ў краіне зроблена нямала для фарміравання спрыяльнага навакольнага асяроддзя і павышэння эфекту ад рэалізацыі прыродаахоўных мерапрыемстваў. Праца па паляпшэнні ў гэтым кірунку працягнецца і сёлета.

СТАР. 7

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

■ Парламенцкі дзённік

ЯК РЭАЛІЗАВАЦЬ ПАТЭНЦЫЯЛ?

Парламенцкая дэлегацыя нашай краіны рыхтуецца да візіту ў Кітай, які адбудзецца восенню.

Плануецца, што праца беларускіх заканатворцаў пройдзе ў Пекіне і ў правінцыі Хубэй. **Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ** падчас пасяджэння, прысвечанага падрыхтоўцы да візіту, нагадаў, што Кітай з'яўляецца стратэгічным партнёрам Беларусі. Сенатары вызначылі канкрэтныя напрамкі, якія могуць быць рэалізаваны ў інтарэсах беларускай эканомікі, калі разумна распарадзіцца патэнцыялам, які сёння сфарміраваўся на вышэйшым палітычным узроўні.

«Падрыхтоўка ідзе, але ёсць неабходнасць канкрэтызаваць асобныя палажэнні. Вялікія надзеі звязаныя з праектамі Міністэрства прамысловасці па «БелАЗе», напрацоўкамі па «Гомсельмашы». У час, які застаўся, іх важна падцягнуць, каб у працэсе візіту падпісаць магчымыя пагадненні. Неабходна таксама вырашыць некалькі праектаў па лініі Міністэрства культуры», — расказаў Міхаіл Мясніковіч.

Спікер прывёў у якасці станоўчага прыкладу экспарт у Кітай прадпрыемстваў Брэсцкай вобласці. Разам з тым ён выказаў крытыку ў адрас беларускіх дзяржаўных органаў па пытаннях супрацоўніцтва з Паднябеснай: «Шмат фармалізму. Цэлы шэраг пытанняў, якія акрэсленыя, і па якіх прыняты рашэнні на вышэйшым узроўні, вырашаюцца досыць доўга, не без праблем». Акрамя таго, ён адзначыў, што рашэнні, прынятыя кіраўніком дзяржавы па прыцягненні прамых замежных інвестыцый Кітая, не выконвае ні адна вобласць і горад Мінск. «Непаваротлівыя і прадпрыемствы. Таму трэба сур'ёзна выпраўляць стан спраў, нейкіх непераадольных перашкод тут няма», — лічыць старшыня Савета Рэспублікі.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.
Kryzhevich@zviazda.by

СІСТЭМНАСЦЬ І НОВЫЯ ПЛАНЫ

Адносіны Беларусі і Рэспублікі Карэя абмеркавалі ў Палаце прадстаўнікоў

Міжпарламенцкае супрацоўніцтва паміж краінамі ўжо наладжана, у заканадаўчых органах абедзвюх дзяржаў створаны групы сяброўства. У той жа час, на думку Уладзіміра АНДРЭЙЧАНКІ, старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, трэба надаць кантактам сістэмнасць.

Спікер упэўнены, што трэба праводзіць больш сустрэч на высокім узроўні. Ён прапанаваў арганізаваць сустрэчу парламенцкіх дэлегацый Беларусі і Карэі падчас найбліжэйшай Асамблеі Міжпарламенцкага саюза, у якой прымуць удзел парламентарыі абедзвюх краін. Уладзімір Андрэйчанка нагадаў, што ў лютым нашы краіны адзначалі 25-годдзе са дня ўстанаўлення дыпламатычных адносін:

— Трэба сказаць, што за гэты час многае адбылося, але, відаць, самае галоўнае, што ў нас пашырыліся міждзяржаўныя кантакты. Гэта было зроблена дзякуючы таму, што ў нас было больш сустрэч, візітаў як на ўзроўні дзяржаўных органаў, так і дзелавых колаў. Усё гэта, безумоўна, было накіравана на тое, каб развіваць наша гандлёва-эканамічнае, культурнае супрацоўніцтва. Трэба сказаць, што за 2016 год у нас крыху паменшыўся таварааварот. Але ў першым квартале гэтага года ў нас ідзе павелічэнне на 36%. Думаю, што ў пашырэнні нашых кантактаў важную ролю іграе міжпарламенцкае супрацоўніцтва.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

Гаспадарчым таварыствам пашыраць рамкі

Члены Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па эканоміцы, бюджэце і фінансах абмеркавалі ў Гродне ініцыятывы па рэфармаванні закона «Аб гаспадарчых таварыствах».

Зараз у парламенце ідзе падрыхтоўчы этап па змяненні палажэнняў закона. Сенатары знаёмяцца з практыкай яго прымянення ў рэгіёнах краіны. Прапановы плануецца сабраць да канца гэтага года. Пасля чаго законапраект «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб гаспадарчых таварыствах» будзе прадстаўлены ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі.

У Гродне сенатары наведалі некалькі прадпрыемстваў, а затым сабраліся за круглым сталом, каб выслухаць заўвагі і прапановы прадстаўнікоў абласной улады, судовых органаў, кіраўнікоў буйных прадпрыемстваў.

Аказалася, што рамкі існуючага закона аб гаспадарчых таварыствах сталі цеснымі і не адпавядаюць сучаснаму моманту. Новага падыходу, на думку мясцовых улад, патрабуе прававая база па фінансавым аздараўленні сельскіх гаспадарак.

Закранулі пытанне і аб паўнамоцтвах кіраўнікоў прадпрыемстваў. Маўляў, іх дзеянні занадта рэгламентаваны, што стрымлівае рашэнне важных пытанняў. **Анатоль ГРЫШУК**, які ўзначальвае рабочую групу па правядзенні маніторынгу, **сенатар і генеральны дырэктар Гродзенскага мясакамбіната**, лічыць, што паспяховыя прадпрыемствы не патрабуюць частых праверак, а больш увагі трэба ўдзяляць фінансава слабым і нерэнтабельным.

Прагучала думка звярнуць увагу на прававое рэгуляванне карпаратыўных канфліктаў. А канкрэтна, стварыць дакладны механізм рэарганізацыі, каб крэдыторы своечасова змаглі забраць сваю маёмасць.

— Жыццё не стаіць на месцы, развіваецца, і з'яўляюцца пытанні, якіх учора яшчэ не было, — адзначыў **старшыня парламенцкай камісіі Уладзімір ПАНЦЮХОЎ.** — Напрыклад, сутыкаемся з такой сітуацыяй, калі адно прадпрыемства пераўтварылася ў другое, у выніку чаго аказалася, што спагнаць запазычанасць няма з каго і вінаватых быццам бы няма. Гэтыя моманты трэба падвесці пад закон.

Закон «Аб гаспадарчых таварыствах» быў прыняты 25 гадоў таму. За гэты перыяд было ўнесена нямала змяненняў, дапаўненняў, істотная карэкціроўка адбылася ў 2006 годзе. Зараз наспела новая неабходнасць удасканаліць прававую базу. Маніторынг якраз і накіраваны на тое, каб ліквідаваць праблемы і нестыкоўкі, якія ўзнікаюць на практыцы.

— У нас адбылося адкрытае, ініцыятыўнае і дзелавое абмеркаванне закона, — падкрэсліў Уладзімір Панцюхоў. — Толькі ў Гродзенскім рэгіёне мы вызначылі 12 сур'ёзных момантаў, якія будуць аналізавацца. Змены закрануць і дзейнасць назіральных саветаў, і адкрытасць гаспадарчых таварыстваў, і ўзаемадзеянне іх з інвестарамі. Будуць акрэслены і пытанні ліквідацыі.

Рэспубліка Беларусь з'яўляецца членам Еўразійскага эканамічнага саюза і мае намер стварыць добрыя ўмовы для развіцця і вядзення бізнесу. Зацікавіць інвестараў можна прывабным механізмам работы гаспадарчых таварыстваў: удасканальваць карпарацыйныя адносіны, развіваць рынак каштоўных папер.

Новы закон павінен забяспечыць большую дзелавую ініцыятыву, даць магчымасць працаваць тым, хто сапраўды гэтага хоча.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
margo@zviazda.by

■ Супрацоўніцтва

Маршрут электробуса: Мінск — Бялград

Па выніках першага квартала гэтага года Сербія ўваходзіць у 10 галоўных гандлёва-эканамічных партнёраў Беларусі. У параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года тавараабарот вырас больш чым у 3 разы і склаў каля 33 мільёнаў долараў, паведаміў старшыня камітэта эканомікі Мінгарвыканкама Мікалай РАГАШЧУК. Дні Мінска ў Бялградзе, якія пройдуць 5—7 чэрвеня, прызваны яшчэ больш умацаваць цесныя сувязі дзвюх дзяржаў.

Цяпер з Беларусі ў Сербію пастаўляюцца трактары, маторна-транспартныя сродкі, бытавая тэхніка. Адным з ключавых момантаў візіту беларускай дэлегацыі стане прэзентацыя электробуса, які ў хуткім часе будзе пушчаны па вуліцах Бялграда. Калі тэставы перыяд пройдзе паспяхова, будзе заключаны дагавор на пастаўку 60 машын. Дарэчы, усе тралейбусы, якія ўваходзяць у тэхнапарк сербскай сталіцы, таксама беларускай вытворчасці. Падчас візіту запланавана сустрэча старшыні Мінгарвыканкама з мэрам Бялграда, наведванне транспартнага прадпрыемства, тэхнапарка, вывучэнне энергасістэмы горада. Акрамя таго, адбудзецца бізнес-форум, у якім прымуць удзел каля 30 беларускіх кампаній. Асаблівая ўвага будзе ўдзелена прадстаўленню турыстычнага патэнцыялу Мінска.

Дар'я КАСКО. *kasko@zviazda.by*

■ Дзень меліяратара

РАТАВАЛЬНІКІ ЗЯМЛІ

У 60-х гадах мінулага стагоддзя ў Беларусі на аднаго чалавека прыходзілася 1,24 га сельгасугоддзяў, але ўжо да 2005 года гэтая лічба паменшылася да 0,91 га. Здавалася б, што гэта сур'ёзная нагода занепакоіцца аб харчовай бяспецы. Але намеснік дырэктара Дзяржаўнага аб'яднання па меліярацыі зямель, воднай і рыбнай гаспадаркі «Белвадгас» Віктар МЕЛЬНІК супакойвае: атрыманне больш высокіх ураджаяў магчымае, калі паляпшаць зямлю і сачыць за яе водна-паветраным рэжымам. Для гэтага сёння і патрэбна меліярацыя.

Дзяржаўнае кіраванне ў галіне меліярацыі ў краіне ажыццяўляе Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання з яго структурным падраздзяленнем па меліярацыі зямель, воднай і рыбнай гаспадаркі «Белвадгас». У яго склад уваходзіць 156 прадпрыемстваў, размешчаных амаль у кожным раёне краіны. Там пастаянна працуюць над удасканаленнем меліярацыйных сістэм.

«Глебава-кліматычныя ўмовы ў некаторых частках краіны не дазваляюць з-за пераўвільгатнення весці інтэнсіўнае земляробства. З гэтай прычыны асушванне, якое распачата на тэрыторыі краіны ўжо больш за 120 гадоў таму, мае ключавое значэнне для развіцця сельгасвытворчасці», — расказаў Віктар Мельнік. Паводле яго слоў, у Беларусі сёння асушана больш за 3,4 млн га пераўвільготненых зямель.

«На меліяраваных землях вырабляецца 30% сельгаспрадукцыі. Гаворачы аб кармавой базе — больш за 50%. Многія асушаныя землі з'яўляюцца асноўнымі для вырошчвання ўраджаю. У краіне ёсць нават калгасы, якія створаны цалкам за кошт зямель, што раней былі забалочаныя і непрыстасаваныя для жыцця. Сёння там пабудаваны аграгарадкі з усёй інфраструктурай. Дзякуючы меліяратарам людзі там жывуць паўнавартасным жыццём і атрымліваюць высокія ўраджаі», — расказаў намеснік дырэктара.

Нягледзячы на ўсе цяжкасці, якія адчуваліся пасля распаду Савецкага Саюза, меліярацыя ў краіне захавалася. Развіваюцца і праектныя інстытуты, і вытворчасць спецыяльнай тэхнікі. Пачынаючы з 2013 года дзяржавай было выдзелена каля 1 трлн недэнамінаваных рублёў на тэхпераўзбраенне. Была набыта тэхніка і распрацавана новая, з улікам вопыту замежных калег.

Зараз спецыялісты ў сферы меліярацыі працуюць у рамках дзяржаўнай праграмы развіцця аграрнага бізнесу на 2016—2020 гады. Праграма паспрыяе ўвесці ў эксплуатацыю дадаткова 179 тысяч гектараў меліяраваных сельгасугоддзяў, забяспечыць аптымальны водны рэжым для вырошчвання сельгаскультур на плошчы 2,64 млн га.

«Як вынік выканання праграмы чакаецца прыбытак ураджаю на 9 цэнтнераў кармавых адзінак з гектара ці 23,7 млн цэнтнераў кармавых адзінак на меліяраваных землях. Акрамя таго, рэканструкцыя меліярацыйных сістэм пры ўнясенні аптымальнай дозы ўгнаенняў забяспечыць павелічэнне ўраджайнасці сельгаскультур на пэўных тэрыторыях ад 1,3 да 3 раз», — запэўніў Віктар Мельнік.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.
Kryzhevich@zviazda.by

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне намесніку начальніка аддзела бухгалтарскага ўліку і кантрольнай работы міністэрства Сакоўскай Таццяне Сяргееўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Рынкі адказалі ростам акцый на рашэнне Трампа па клімаце



Таргі на Уол-стрыт завяршыліся ростам каціровак пасля заявы Дональда Трампа аб выхадзе Злучаных Штатаў з Парыжскага пагаднення аб клімаце. Некалькі буйных бізнесменаў выказаліся супраць такога кроку, але прэзідэнт ЗША настойвае на тым, што гэта прынясе карысць амерыканскай эканоміцы. З крытыкай рашэння выступіў і кіраўнік кампаніі General Electric Джэфры Імельт, які заявіў, што ён расчараваны гэтым крокам. Заснавальнік кампаніі Tesla Ілан Маск паведаміў, што ў адказ на рашэнне Трампа выходзіць з прэзідэнцкага савета.

Больш за 30 чалавек загінулі ў выніку нападу на курортны комплекс у Маніле

Пра гэта паведамляюць мясцовыя СМІ, са спасылкай на даныя пажарнай службы, згодна з якімі людзі загінулі, задыхнуўшыся ў дыме падчас пажару. Узброены мужчына пракраўся ў гульнявую зону комплексу, дзе падпаліў некалькі сталоў і адкрыў агонь. Сярод наведвальнікаў узнікла паніка, многія вырашылі, што на іх напалі тэрарысты. Па словах відавочцаў, перапужаныя людзі выскоквалі з вокнаў другога паверха. Між тым, як заяўляюць у паліцыі, нападбыў не тэрактам, а спробай рабавання, якую распачаў налётчык-адзіночка, які затым загінуў у перастрэлцы.

Сёлета кошт нафты не перавысіць 50 долараў за бараль

Аб гэтым заявіў кіраўнік брытана-нідэрландскага нафтагазавага канцэрна Shell Бэн ван Бердэн. «Я думаю, што нафтавыя цэны могуць пайсці ўверх, калі паглядзець на фундаментальныя фактары. Гэта будзе залежаць ад АПЕК, — дадаў ён. — Налета цэны будуць вышэйшыя, чым цяпер, але наколькі менавіта, гэта немагчыма прадказаць».

Пятніца можа стаць дадатковым выхадным днём праз 15 гадоў

Так, прынамсі, лічыць першы намеснік старшыні Банка Расіі Сяргей Швяцоў. «Мы развіваем медыцыну, развіваецца прадукцыйнасць працы, і ўзнікае пытанне, чым будуць занятыя ўсе цяперашнія работнікі», — сказаў ён на Пецярбургскім эканамічным форуме. Швяцоў адзначыў, што, калі будзе тры выхадныя дні, гэта адкрые новыя сектары, звязаныя з аказаннем паслуг па баўленні вольнага часу.

■ Сталічны час

ЗА «КІЕЎСКІ СКВЕР» І СУПРАЦЬ «КОЗЫРАВА»

Як мінчане хочуць назваць новыя станцыі метро



Назвы станцый для чацвёртай лініі сталічнага метро Мінгарвыканкам зацвердзіў яшчэ практычна год таму. Аднак апублікаваная ў верасні рэдакцыя генплана Мінска ўнесла свае карэктывы ў праектаванне новай веткі. Так, многія станцыі памянялі сваё месцазнаходжанне, а іх назвы, адпаведна, — страцілі сваю актуальнасць. Нядаўна былі новыя прапановы па найменні, але, як аказалася, не ўсе з іх задавальняюць мінчан.

Я галасую...

Як растлумачыў **намеснік галоўнага інжынера Дырэкцыі па будаўніцтве Мінскага метрапалітэна Дзяніс ЗАБАЛОТНЫ,** па рэгламенце на працягу двух тыдняў пасля публікацыі гараджане могуць адправіць свае заўвагі і прапановы ў іх установу. І сапраўды, некалькі лістоў і па пошце, і па факсе прыйшло: некаторыя проста выказвалі сваё адабрэнне, некаторыя — уносілі невялікія карэктывы ў прапанаваныя назвы. Паколькі тэрмін скончыўся, вынікі ўжо падведзены: уся інфармацыя будзе накіраваная камісіі па найменні і перайменаванні праспектаў, вуліц, плошчаў і іншых складовых частак г. Мінска, якая на сваім пасяджэнні і прыме канчатковае рашэнне.

Аднак Мінгарвыканкам вырашыў не абмяжоўвацца такой складанай схемай збору грамадскай думкі, пайшоў далей і арганізаваў адкрытае галасаванне на сваім сайце, якое яшчэ працягваецца. Мінчан пытаюцца пра тое, як яны ставяцца да варыянтаў назваў дзевяці будучых станцый. Адказаць можна «падтрымліваю» ці «не падтрымліваю» або прапанаваць свой варыянт. У перспектыве чацвёртая лінія стане кальцавой, а значыць — загружанай, так што ўсё, што з ёй звязана, выклікае ў гараджан жывую цікавасць. Пакуль на абмеркаванне вынеслі ўчастак, які пройдзе пад Другім кальцом па вуліцах Дзянісаўскай, Аэрадромнай і праспекце Пушкіна.

Натхненне ад чыгункі і «дрэннага надвор'я»

Спадабалася жыхарам сталіцы назва «Кіеўскі сквер» — станцыя павінна з'явіцца на скрыжаванні вуліц Арлоўскай і Гая, за такі варыянт прагаласавалі 73% рэспандэнтаў. Усё лагічна: побач аднайменны парк, кінатэатр «Кіеў» і бульвар Тараса Шаўчэнкі, да таго ж у самой сталіцы Украіны станцыя «Мінская» існуе ўжо каля 35 гадоў.

А вось назвы «Козырава» і «Лакаматыўная» атрымалі менш за ўсё падтрымкі — па 43% галасоў. Дарэчы, яны абедзве так ці інакш звязаныя з чыгункай. Калі сучасным мінчанам слова Козырава не гаворыць практычна нічога, то ў XIX стагоддзі ўсе ведалі раён, у якім жылі пераважна сем'і чыгуначнікаў. Як мяркуецца, зараз Козырава «адновіцца» на вуліцы Велікаморскай, што ў раёне чыгуначнай станцыі «Мінск Паўднёвы». З «Лакаматыўнай» — паблізу чыгуначнай станцыі «Сталічная» — яшчэ прасцей: непадалёк дэпо. Наогул чыгунка адыграла ключавую ролю ў развіцці Мінска, які са сціплага павятовага гарадка ператварыўся ў значны транспартны вузел.

Менш за палову галасоў набраў і варыянт назвы станцыі на скрыжаванні вуліцы Панамарэнкі і праспекта Пушкіна «Тучынка». Магчыма, з-за аддаленай асацыяцыі з дрэнным надвор'ем. Насамрэч, так у даваенныя гады ў народзе звалі раён, дзе размяшчаліся цагляныя заводы. А вось фальварак і вёска з такой назвай яшчэ раней былі ў раёне цяперашняй вуліцы Гусоўскага. У мінулай рэдакцыі найбліжэйшую станцыю хацелі назваць Харкаўскай, а мясцовым жыхарам па душы і наогул трэці варыянт — Мядзвежына.

Мабыць, самая сучасная назва «Мінск-Мір» атрымала падтрымку 65% прагаласаваўшых. Тут таксама няма ніякіх прамудрасцяў: так называецца мікрараён, які будуецца паблізу ад вуліцы Аэрадромнай.

На аднайменнай вуліцы, але не ў гонар яе

Палова рэспандэнтаў прагаласавала «за» назву «Цівалі» для станцыі, якая з'явіцца на скрыжаванні вуліц Прытыцкага і праспекта Пушкіна. Мілагучная назва сыходзіць каранямі ў сярэдзіну XIX стагоддзя. Першы і па гэты дзень галоўны парк Цівалі з'явіўся ў Капенгагене, пасля чаго падобныя месцы адпачынку сталі ўзнікаць у многіх еўрапейскіх гарадах. У Мінску пабудавалі фальварак «Цівалі», дзе знаходзіліся рэстаран, летні тэатр, а таксама адзіны ў горадзе вятрак. На доўгія гады прадмесце стала цэнтрам культурнага жыцця горада. Дзіўна, але ў савецкія гады слова захавалася ў назве калгаса, і толькі ў 1970-я ў сувязі з забудовай горада на некалькі дзесяцігоддзяў знікла з ужытку.

Па 60% набралі назвы станцый «Політэхнічная» — скрыжаванне вуліц Сурганава і Якуба Коласа — у гонар размешчаных тут карпусоў БНТУ, былога політэхнічнага інстытута, «Альшэўская» і «Берасцейская» на скрыжаванні вуліцы Альшэўскага і праспекта Пушкіна і вуліц Уманскай і праспекта Дзяржынскага адпаведна. Варыянтаў, чаму з'явілася назва «Берасцейская», у мінчан шмат: тут і царкоўная унія, і кінатэатр «Бярэсце», і выезд на брэсцкую шашу, праўда, да месцазнаходжання станцыі прамых адносін яны не маюць. Затое замянілі варыянт «Праспект Дзяржынскага», які не надта спадабаўся гараджанам.

Калі вы думаеце, што «Альшэўская» адсылае да назвы вуліцы, то вы памыляецеся. Сапраўды, першапачаткова быў прыняты такі варыянт, аднак потым вырашылі сакцэнтаваць увагу на больш ранняй гісторыі Мінска. Менавіта тут знаходзілася невялікая вёска Альшэва, якая потым стала Альшэўскай вуліцай горада. Аднак савецкія ўлады выкарысталі «ўдалую» магчымасць і далі вуліцы нібы новую, а нібы і не, назву ў гонар Героя Савецкага Саюза Мікалая Альшэўскага. Станцыя метро закліканая захаваць зніклы тапонім.

Толькі 3% апытаных прапанавалі свае альтэрнатыўныя назвы. Усе меркаванні будуць улічаныя, а канчатковае рашэнне прынята ў найбліжэйшы час. Праўда, пакуль самай актуальнай застаецца станцыя «Чаканне», бо ўзводзіць чацвёртую лінію метро пачнуць бліжэй да 2030 года.

Дар'я КАСКО.
kasko@zviazda.by

■ Бяспечнае лета

НАВУЧЫЦЬ, ЗАБАЎЛЯЮЧЫ

У Віцебску прэзентавалі другі ў краіне Цэнтр бяспекі. Яго прызначэнне — навучыць правільным паводзінам у экстрэмальных сітуацыях.

Як паведаміў **міністр па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь, генерал-лейтэнант унутранай службы Уладзімір ВАШЧАНКА,** аналагічныя ўстановы з'явяцца ва ўсіх абласцях. У перспектыве — і ў райцэнтрах. А самы першы ў краіне запрацаваў у 2015 годзе ў Гомельскай вобласці. Дзейнічае ён на базе ліцэя пры Універсітэце грамадзянскай абароны МНС. Яго наведвальнікамі за гэты час сталі больш за 40 тысяч чалавек.

У цырымоніі адкрыцця цэнтра ў Віцебску бралі ўдзел прадстаўнікі парламента. Гасцям паказалі пакой, дзе арганізоўваюць тэматычны квест. У гульнявой форме тут вучаць выклікаць ратавальнікаў, правільна дзейнічаць падчас пажараў у памяшканнях і на дварах.

Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

Падчас адкрыцця цэнтра.

Абсталяванне цэнтра дазваляе стварыць штучную маланку, імітаваць пажар з вялікім задымленнем. Мадэлююцца сітуацыі, калі трэба дапамагчы тым, хто праваліўся пад лёд, каго ўдарыла токам.

А ці ўсе ведаюць, як правільна карыстацца ліфтам? І што рабіць, калі з табой у ліфце едзе зламыснік? У Цэнтры бяспекі навучаць аптымальна дзейнічаць у розных небяспечных выпадках. Як і рataваць, калі ў дыхальныя шляхі чалавека трапіў нейкі прадмет. Тут, наогул, навучаць першай дапамозе пры траўмах і крытычных станах. У прыватнасці, раскажуць і пакажуць, чым дапамагчы пры ўкусе змяі і насякомых, калі прахожы страціў прытомнасць, калі чалавек тоне...

Ёсць тут і стэнд з інфармацыяй пра АЭС у розных краінах. Яго мэта — паменшыць адпаведную фобію ў грамадстве, бо ў ЕС і Расіі такіх станцый дзясяткі.

Цэнтр можна будзе наведаць у складзе групы па папярэдняй заяўцы. Міністр упэўнены, што гэта месца будзе цікавым і карысным для турыстаў, бо экскурсіі сюды дазволяць пазбегнуць траўмаў і захаваць жыццё.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

■ Адчальваем!

48 кіламетраў на байдарках

Фестываль воднага турызму «Мотальская рэгата» пройдзе ў гэтыя выхадныя

Фестываль праводзіцца другі раз. Сёлета заяўкі на ўдзел прыслалі 20 экіпажаў — з Віцебска, Брэста, Баранавічаў, Пінска, Камянца, Ваўкавыска. Прыедуць таксама каманды з Украіны і Расіі.

На працягу двух дзён удзельнікам трэба будзе пераадолець 48 кіламетраў па рацэ Ясельда. Старт спаборніцтваў пройдзе сёння. Адчальваюць ад возера Споранскае ў Бярозаўскім раёне і фінішуюць у аграгарадку Моталь Іванаўскага раёна. У заплыве ўдзельнічаюць байдаркі-адзіночкі, змешаныя і мужчынскія экіпажы. Увечары ў аграгарадку раскінуць палатачны лагер. Будзе арганізаваны конкурс турысцкай песні, спаборніцтвы па дартсе.

У нядзелю каманды чакае наступнае выпрабаванне: праплысці па Ясельдзе ад Моталя да вёскі Буса, развярнуцца і веславаць супраць цячэння ў зваротным кірунку. А для гледачоў падрыхтавана спартыўна-культурная праграма. Ім прапануюць згуляць у пляжны валейбол, міні-футбол, паказаць сябе ў мастацкім кіраванні байдаркай і веласіпедам, паслухаць выступленні творчых калектываў.

Пераможцаў і прызёраў рэгаты вызначаць па суме вынікаў двух дзён. Арганізатары фестывалю — Іванаўскі райвыканкам, эколага-краязнаўчае грамадскае аб'яднанне «Ясельда» і ўпраўленне спорту і турызму Брэсцкага аблвыканкама.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

■ А не шкодзь!

Карась сапраўды атрымаўся «залатым»...

У Шумілінскім раёне работнікі Гарадоцкай міжрайінспекцыі затрымалі браканьера з сеткамі, які прамышляў на возеры Машно каля вёскі Прыазёрная.

Як расказалі ў Дзяржінспекцыі, трыма сеткамі даўжынёй 130 метраў парушальнік вылавіў 50 асобін залатога карася і яшчэ восем іншых рыбін. А ў Віцебскай вобласці ўсё яшчэ дзейнічае нераставая забарона (па 8 чэрвеня ўключна) і трайныя таксы за незаконна вылаўленую рыбу. Адпаведна, улоў абышоўся браканьеру амаль у 22 тысячы рублёў. Залаты карась — абарыгенны від і ў адрозненне ад сярэбранага (завезенага) ацэньваецца нашмат даражэй, у перыяд нерасту — па 414 рублёў за кожную асобіну. Вырашаецца пытанне крымінальнай адказнасці мужчыны.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

«ДОБРАЯ ДУМКА ПРА ЧАЛАВЕКА —

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вядома, сёння сітуацыя і жыццё прыкметна змяніліся. Сёння часам можна пачуць аб хрысціянах зусім іншае: «Глядзі, як сябе паводзіць, а яшчэ праваслаўны!». Людзі, далёкія ад Царквы, сёння чакаюць ад вернікаў амаль роўнаанёльскага жыцця, суцэльную любоў і добрае стаўленне адно да аднаго і асабліва да іх. Мы стараемся не асуджаць такіх людзей і не крыўдзімся на іх, бо любоў і дабрыню прапаведаваў Хрыстос Збавіцель. Ён, нават знаходзячыся на крыжы, маліўся за сваіх распінацеляў.

Адказваючы на ваша пытанне, мне вельмі цяжка вызначыць нейкія асаблівасці ў людзей, якія маюць розныя нацыянальныя карані, няхай гэта будуць беларусы, рускія ці ўкраінцы. Усе мы — славяне. У нас адзін Бог, адна Царква, адна вера, адзін алфавіт, адна культура. У нас адзін генетычны код. Так, напрыклад, у сям'і брат і сястра могуць любіць розную музыку, хтосьці захапляецца тэхнікай, а хтосьці — жывапісам, так і ў нацыянальнасцях. Аднак ад гэтага яны не становяцца чужымі, а працягваюць заставацца роднымі людзьмі. Сёння нашу славянскую сям'ю спрабуюць штучна падзяліць, ды яшчэ і пасварыць. І да таго часу, пакуль мы будзем захоўваць духоўнае адзінства ў Хрысце, ва ўлонні Царквы Хрыстовай, мы будзем заставацца вялікай духоўнай праваслаўнай сям'ёй.

«Убачыў малады чалавек дзяўчыну, спадабалася яна яму вонкава, а потым пачынае знаёміцца з ёй бліжэй, а там, глядзіш, і пакахалі адно аднаго, а потым і злучыліся на ўсё жыццё».

— Зараз нярэдка сустракаецца такое, што для веруючага чалавека абрадавы бок веры становіцца важнейшым за яго ўнутранае, духоўнае жыццё.

— Бянтэжыцца такім становішчам не варта, але разумець сітуацыю трэба. І пастыры, ведаючы пра гэта, павінны імкнуцца выпраўляць яе. Многія людзі прыходзяць у праваслаўныя храмы таму, што ім знешне нешта спадабалася: архітэктура, харавы спеў, богаслужэнне, пропаведзь. Можа быць, першы раз чалавек зайшоў у храм дзеля цікавасці, але хто ведае, можа быць Гасподзь такім чынам заклікае яго да Сябе. Можа быць, праз нейкі час гэты чалавек пачне глыбей знаёміцца з жыццём Царквы, а потым зацікавіцца і багаслоўскімі пытаннямі. Трэба сказаць, што такія працэсы — частая з'ява. Як адбываецца ў звычайным жыцці? Як часта ствараюцца сем'і? Убачыў малады чалавек дзяўчыну, спадабалася яна яму вонкава, а потым пачынае знаёміцца з ёй бліжэй, а там, глядзіш, і пакахалі адно аднаго, а потым і злучыліся на ўсё жыццё.

Прыкладна такое ж адбываецца і з абрадавым бокам жыцця нашай Царквы. Жыццё ў Царкве мае знешні і ўнутраны складнік. Знешні, абрадавы бок мае важнае значэнне, але ён не галоўны. Звярніце ўвагу — многія літургічныя дзеянні ў нас называюцца таінствамі. Гэта значыць, за знешнімі дзеямі святаром здзяйсняецца нешта таямнічае, тое, што чалавек не бачыць, але адчувае. Мы не бачым Благадаць Святога Духа, але Яна дзейнічае і жыватворыць кожнага, хто мае веру і прыступае да таінстваў з пакорай. Знешні бок не павінен станавіцца самамэтай, але і без яго мы абысціся не можам. Калі хтосьці больш звяртае ўвагу на абрадавы бок, то ў гэтым выпадку пастыр павінен растлумачыць, што для нас галоўнае, а што другараднае.

— А што вас прывяло да веры?

— У нас у сям'і тата быў чалавекам няверуючым — перакананым атэістам, хоць і нарадзіўся ў сям'і святара. Так склалася, што ў тыя, ужо далёкія, паслярэвалюцыйныя гады ўсіх дзяцей з сем'яў святароў, чыіх бацькоў высылалі ў лагеры, адпраўлялі ў прытулкі, а там начыста выбівалі з іх веру. Праўда, у канцы жыцця мой тата ўсё ж прыйшоў да Бога. А мама была чалавекам верующым. У нас у сям'і было, калі так можна выказацца, два супрацьлеглыя бакі.

У пасляваенны час у горадзе Карагандзе, дзе мы жылі, служыў адзін з апошніх опцінскіх манахаў — айцец Севасціян. Тады ён быў простым іераманахам, які адбыў ссылку ў сталінскіх лагерах ды так і застаўся на ўсё жыццё ў Карагандзе. У 1996 годзе схіархімандрыт Севасціян быў далучаны да ліку святых. Яго малітвамі Гасподзь здзяйсняў мноства цудаў, і мы, тады яшчэ зусім маладыя людзі, бачылі гэта і, вядома, убіралі ў свае душы ўсё, што адбывалася вакол нас. Магу прывесці маленькі прыклад. Здзяйсняе бацюшка паніхіду і памінае імёны з запісак. Раптам спыняецца і пытаецца: «Хто падаў запіску аб супакаенні такога? Ён жывы». А гэты чалавек з вайны не прыйшоў, і ўсе думалі, што ён памёр. На самай справе мужчына ляжаў у шпіталі і не пісаў лісты, каб не засмучаць блізкіх, а праз нейкі час вярнуўся дадому.

У нашай сям'і хварэла маці. Ёй аднойчы зрабілі найскладанейшую аперацыю. У яе выздараўленне дактары не верылі. Непрытомнае цела мамы на каталцы адпіхнулі да ўвахода ў морг. А бацюшка якраз у гэты момант рыхтаваўся здзяйсняць літургію і, убачыўшы, што ўваходзіць у храм сяброўка мамы, паклікаў яе і сказаў: «Насця, вось табе прасфара і святая вада. Бяжы хутка да Анечкі ў бальніцу, хай з'есць прасфару і пап'е святой вады, а мы будзем зараз маліцца». Насця ўсё так і зрабіла. На здзіўленне дактарам, мама засталася жывой і з часам пайшла на папраўку.



Разам з айцом Севасціянам маліліся і падвізаліся манахіні, якія, як і ён, былі сапраўднымі падзвіжнікамі і нават валодалі адмысловымі благадатнымі дарамі, мелі дар празорлівасці. Калі я вырашыў паступаць вучыцца ў Маскоўскую духоўную семінарыю, у адной гутарцы са мной матушка Агнія парэкамендавала добра падрыхтавацца. «У цябе ёсць настольны каляндар?» — спытала яна мяне. — Куды ты хочаш ехаць паступаць?» «У лаўру прападобнага Сергія Раданежскага», — адказваю. «А які там галоўны храм?» — задае пытанне манахіня. «Троіцкі сабор», — кажу. «А трапар Святой Тройцы ведаеш? Трэба ведаць. Вывучы, спатрэбіцца. А трапар прападобнаму Сергію Раданежскаму ведаеш? Вывучы, спатрэбіцца. А 50-й Псалом ведаеш?» Кажу: «Ведаю». «Прачытай», — кажа яна. «Памілуй мяне, Божа, па вялікай міласці Тваёй і па мноству шчодрасцяў Тваіх...» — чытаю. «Ну ўсё, даволі, даволі, — ківае матушка. — А 90-й псалом ведаеш?» «Ведаю. Той, хто жыве з дапамогаю Усявышняга, пад покрывам Бога Нябеснага...» — пачынаю чытаць. «Ну ўсё, даволі, даволі, — усміхаецца яна. — А лічбы царкоўнаславянскія ведаеш, па-царкоўнаславянску чытаць умееш?» Я пачынаю чытаць і яна зноў: «Ну, хопіць, хопіць». Потым пачала лічбы пытацца па чарзе. «Нядрэнна, нядрэнна, ты добра падрыхтаваўся, так, глядзіш, і адразу ў другі клас паступіш», — кажа яна. Потым спытала, чым цяпер займаюся. А я тады вучыўся ў прафтэхвучылішчы, і трэба было пасля яго прайсці адпрацоўку. І расказаў ёй, што гарадскім дзецям можна было лёгка атрымаць дыплом і не ехаць на адпрацоўку ў калгас. «А дыплом дадуць?» — пытаецца. «Дадуць», — адказваю.

Калі прыехаў у семінарыю і здаў усе экзамены, пайшоў глядзець вынікі. На стэндзе вывесілі спісы тых, хто паступіў, але мяне ў іх не аказалася. Спускаюся на другі паверх і чую, што нехта называе прозвішчы. Падыходжу, пытаюся, чым магу дапамагчы, можа быць, кагосьці паклікаць. «А як тваё прозвішча?» — пытаецца бацюшка. «Панамароў», — кажу. «Бягом да інспектара ў кабінет!» Іду, заходжу да яго ў кабінет, там камісія чалавек з 15. Спыталі маё прозвішча, імя, а потым адзін з іх пачынае пытацца ў мяне слова ў слова, як матушка, у той жа чарговасці: пра галоўны храм, трапары Святой Тройцы і прападобнаму Сергію Раданежскаму, псалмы 50-й і 90-й, папрасіў пачытаць па-царкоўнаславянску і лічбы назваць. Усе словы — адзін у адзін як матушка пыталася. І на ўсе мае адказы, пытаючы, бацюшка рэагаваў аднолькава: «Ну, хопіць, хопіць». А потым і пра дыплом і адпрацоўку спыталі. Хіба не цуд? І, паверце, у маім жыцці такіх прыкладаў мноства.

— І ўсё ж такі сэнс хрысціянскага жыцця — гэта перш за ўсё любоў. Як яе варта праяўляць?

«Мы не бачым Благадаць Святога Духа, але Яна дзейнічае і жыватворыць кожнага, хто мае веру і прыступае да таінстваў з пакорай».

7 АСАБІСТЫХ ПЫТАННЯЎ

— Як зразумець, дзе дабро, дзе зло?

— Як па пладах можна даведацца пра дрэва, так і па справах чалавека можна даведацца, дабро гэта ці зло. Размаўляючы з прыхаджанамі, я часта рэкамендую кожнаму пратэсціраваць сябе, хто ж я ёсць на самай справе. У пасланні апостала Паўла да Галатаў ёсць выдатныя думкі пра плады духу. Гэта «... любоў, радасць, мір, доўгацярплівасць, дабрыня, міласэрнасць, вера, лагоднасць, устрыманне» (Гал. 5, 22—23). Калі ў мяне ёсць гэтыя добрыя якасці, то значыць, я на выратавальным шляху. А калі іх няма, а толькі справы плоці, пра якія кажа апостал Павел: «Учынкі плоці вядомы, вось яны: пралюбадзейства, блуд, нечыстата, разбэшчанасць, ідаласлужэнне, чарадзейства, варожасць, сваркі, зайздрасць, гнеў, звады, раздоры, [спакусы], ерасі, нянавісць, забойствы, п'янства, бясчынствы і таму падобнае; папярэджваю вас, як і раней папярэджваў, што тыя, хто робіць так, Царства Божага не ўнаследуюць» (Гал. 5, 19—21).

— Як вы адпачываеце?

— Для мяне вялікім суцяшэннем з'яўляецца богаслужэнне. Успамінаю маму. Яна мне казала, што я адпачываць не ўмею, як усе людзі. А я схаджу на службу, а ўжо тым больш калі сам служу, адразу прыліў сіл адчуваю. Упэўнены, што гэта Гасподзь падмацоўвае. Целам часам стамляешся, а душой заўсёды адпачываеш.

— Самы дарагі падарунак, які вам зрабілі бацькі?

— Па-першае, яны падарылі мне жыццё! Па-другое, іх жыццё для мяне яркі і непаўторны ўрок і прыклад. Я да гэтага часу памятаю, што яны ніколі не высвятлялі адносіны пры дзецях. Часам тата на працы затрымаецца, а ў мамы спраў безліч, ёй дапамога патрэбна: «Зараз прыйдзе бацька дадому, я яму ўсё выкажу!» — пагарачыўшыся, казала мама. Тата прыходзіць, мама пачынае яму нешта казаць, а хвілін праз дзесяць чуем — яны смяюцца. Яна яму папрок — ён ёй жарт або анекдот. Тата ўмеў звесці ўсё на жарт. Таму і сварак у іх сур'ёзных ніколі не было. Мудрыя былі бацькі.

— Без чаго не можа жыць хрысціянін?

— Вядома, без Бога.

— Што можа ўпрыгожыць ваш дзень?

— Можна гэта зрабіць самому. Раніцай прачнуўся, звесіў ногі з ложка і сказаў: «Слава Айцу, і Сыну, і Святому Духу. Слава Табе Божа, што я жывы. Навучы мяне, Госпадзі, выконваць волю Тваю». Потым ранішняя малітва. У плыні дня вельмі важна навучыцца бачыць у кожным чалавеку вобраз Хрыста. Тады кожная сустрэча з кім пажадаеце будзе радасцю.

— Якая кніга змяніла вашае жыццё?

— Безумоўна, Евангелле. Калісьці я захапляўся кнігамі пра ваенных лётчыкаў, ды і сам хацеў ім стаць, шмат чытаў пра Івана Кажадуба, Аляксандра Пакрышкіна. А потым даведаўся, што лётчыкам можа стаць толькі камсамолец, а ў той час гэта азначала адмовіцца ад Бога. Таму адразу кінуў думаць пра гэта. Ужо пасля службы ў войску на мяне надзвычайнае ўражанне зрабіла кніга «Маё жыццё ў Хрысце» святога праведнага Іаана Кранштацкага.

— Як зразумець, што жывеш правільна?

— Варта часцей зазіраць у свой унутраны свет і справядліва ацэньваць свае ўчынкі. Даваць бесстароннюю ацэнку свайму жыццю, часцей звяртацца да голасу сумлення. На шляху самапазнання, вядома ж, павінен быць непарушны арыенцір — Евангелле. Праз прызму Евангелля можна лёгка вызначыць і добрае, і злое.

Увечары, кладучыся ў ложак, успомні, што сёння зрабіў? Калі было нешта добрае, скажы: «Госпадзі, слава Табе! Хоць нешта зрабіў з Тваёй дапамогай». А калі зрабіў нешта не тое ці дрэннае, не забудзься сказаць: «Прабач мне, Госпадзі, і дапамажы выправіцца». І пастарайся выправіцца. І так кожны дзень. Толькі так можна прыйсці да добрых вынікаў у духоўным жыцці.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

УЖО ПРАЯВА ЛЮБОВІ»

— Сэнс жыцця чалавека на зямлі — богапрыпадабненне. Мы закліканы стаць богападобнымі. А паколькі Бог — гэта Любоў, то і мы, вернікі-хрысціяне, павінны выхаваць у сабе гэты каштоўны дар. Я ведаў адну жанчыну, якая была ў састарэлым узросце і па немачы сваёй ужо не магла выходзіць з кватэры. Яна вельмі перажывала, што не можа тварыць справы любові і міласэрнасці. Дык вось, яна падыходзіла да акна, абапіралася на падаконнік і глядзела на вуліцу. Бачыць, ідзе па вуліцы мужчына з палачкай, кульгае. Думае: «Госпадзі, ён такі няшчасны, дапамажы яму!» Хтосьці нясе цяжкія сумкі, яна звяртаецца да Бога: «Госпадзі, як цяжка чалавеку, дапамажы яму». Яна з кватэры не магла выйсці, але спачувала людзям, малілася і жадала ім дабра. Хіба гэта не добрыя справы? Гэтага і чакае ад нас Гасподзь: спагады і спачування чужому болю. Гасподзь бачыць наш унутраны стан, наша імкненне шукаць Бога і жаданне імкнуцца ў Царства Нябеснае, а яно знаходзіцца ўнутры нашага сэрца.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Мы павінны памятаць, што Бог заўсёды знаходзіцца ў нашым свеце, нават калі мы адварочваемся ад Яго. Задача кожнага хрысціяніна — прыпадабняцца Хрысту, а на гэтым шляху нам варта змагацца са сваімі страсцямі, якія ў кожным з нас жывуць і ствараюць перашкоду на шляху богапрыпадабнення. Прападобны Серафім Сароўскі сказаў: «Здабудзь дух мірны, і вакол цябе выратуюцца тысячы». Імкненне выхаваць у сабе дух мірны і благадаць Духа Святога — гэта і ёсць мэта хрысціянскага жыцця.

Цяжкі гэты шлях — богапрыпадабненне, але ён цалкам магчымы для кожнага, хто хоча выратаваць сваю душу і ўвайсці ў Царства Нябеснае. Нам варта пачынаць з малога. Калі захочацца адказаць крыўдзіцелю — прамаўчы, трэба імкнуцца не прайсці міма таго, хто жыве ў нястачы. Калі не можаш аказаць канкрэтную дапамогу, то ў думках звярніся да Госпада і скажы: «Госпадзі, не магу дапамагчы, хто ў тым мае патрэбу, дапамажы яму Ты, як можаш». Калі наша жыццё будзе напоўнена справамі дабра, любові і міласэрнасці, зменімся мы і зменіцца ў лепшы бок жыццё людзей на зямлі.

— Але ж не ўсе сёння — пагалоўна веруючыя. Як думаеце, што ўвогуле можа прывесці сучаснага чалавека ў Царкву, калі яго жыццё поўніцца клопатам аб матэрыяльным?

— Думаю, што варта ўспомніць словы Хрыста Збавіцеля: «Не вы Мяне выбралі, але Я вас выбраў» (Ін. 15,16). Гасподзь усіх без выключэння заклікае да выратавання. Але толькі той, хто адгукнецца на заклік Божы і сапраўды пажадае выратавання сваёй душы, — прыйдзе ў Царкву. Мімаволі ўзнікае іншае пытанне: «А чаму не ўсе ў такім выпадку адгукаюцца на гэты заклік?» Адказ просты. Калі чалавек пагодзіцца прыняць Евангелле, то яму прыйдзецца змяніць свой ранейшы заганны лад жыцця. Не ўсе да гэтага гатовыя. Змяняць сябе, працаваць над сабой, над сваімі пачуццямі і думкамі — гэта заўсёды подзвіг. Значна прасцей — паеў і на канапу. А калі ў доме тэлевізар, то яшчэ і забавы пад бокам, ляжы і пстрыкай кнопкамі на пульце. Але гэты шлях бяздзейнасці заўсёды вядзе чалавека ў пагібель.

«Людзі, далёкія ад Царквы, сёння чакаюць ад вернікаў амаль роўнаанёльскага жыцця, суцэльную любоў і добрае стаўленне адно да аднаго і асабліва да іх».

— Зараз па тэлевізары амаль кожны дзень можна ўбачыць тэракты, крушэнні, забойствы, у якіх паміраюць ні ў чым не вінаватыя людзі, дзеці, старыя. Хочаш-не хочаш задаешся пытаннем: чаму Бог гэта дапускае?

— А пры чым тут Бог? Хіба гэта Бог падкладае бомбы, страляе, запускае ракеты, забівае? Бог стварыў чалавека не для таго, каб ён забіваў, а для таго, каб ён, выконваючы запаведзі Божыя, дасягаў святасці і прыпадабняўся Богу, услаўляючы свайго Стваральніка. А ўслаўляючы Бога, удзельнічаў у Божай любові і дабрыні ў Царстве Нябесным. Вось якая была задума ў Бога перад тварэннем свету і чалавека. Але чалавек выбраў іншы шлях, а зграшыўшы і ўсвядоміўшы, што ён нарабіў, зараз шукае сабе ва ўсім апраўданне. Свайго граху і злачынстваў не хоча бачыць, а ва ўсіх бедах і правінах вінаваціць усіх, але толькі не сябе. У гэтым корань усіх нашых бед і нестраенняў. Апынуўшыся ў такім становішчы, чалавек спрабуе зваліць сваю віну на іншага, гэта значыць шукае «ахвярнага казла», а не знаходзячы яго, усё зло перакладае на Бога. І ў выніку ва ўсім вінаваты Бог, але ніяк не чалавек.

Царква на працягу вось ужо двух тысячагоддзяў заклікае людзей не шукаць вінаватых звонку. Чалавек, зазірні ў свой унутраны свет, і ты зразумееш, што Бог нічога дрэннага нам не зрабіў. Усё дрэннае здзейснілі мы самі, супраціўляючыся Богу і жывучы так, як нам хочацца.

— Як вы лічыце, які шлях складанейшы: манаскі або сямейнага жыцця?

— У кожным кірунку ёсць свае цяжкасці і радасці. Не кожны можа стаць манахам і не ў кожнага складваецца сямейнае жыццё. Думаю, што несці подзвіг сямейнага жыцця складаней, чым манаскага. У сям'і кожны імкнецца да свайго асабістага шчасця, а манаская абіцель — гэта таксама духоўная сям'я, але тут усе свядома выбралі гэты шлях і гатовыя жыццё сваё пакласці за бліжняга свайго, каб здабываць благадаці Святога Духа. Сямейнае жыццё — гэта штодзённы подзвіг. Калі подзвігу не будзе, такая сям'я не ўстаіць і распадзецца.

«Гэтага і чакае ад нас Гасподзь: спагады і спачування чужому болю. Гасподзь бачыць наш унутраны стан, наша імкненне шукаць Бога і імкнуцца ў Царства Нябеснае, а яно знаходзіцца ўнутры нашага сэрца».

Многія маладыя людзі, беручыся шлюбам, не разумеюць сапраўднага сэнсу сямейнага жыцця. Нехта ў сямейным жыцці шукае задавальнення для сябе, а нехта спадзяецца, што, уступіўшы ў шлюб, пазбавіцца ад паўсядзённых побытавых клопатаў. Адзін малады чалавек мне калісьці сказаў: «Вось дажыў да трыццаці гадоў і думаю, да якога часу буду сам сабе мыць шкарпэткі і гатаваць ежу? Трэба ажаніцца, і хай жонка клапоціцца пра мяне». А жанчына, дасягнуўшы такога ж узросту, думае: «Дакуль жа я буду працаваць, трэба выйсці замуж і хай муж мяне ва ўсім забяспечвае». Два эгаісты сышліся, паспрабавалі жыць дзеля сябе, але доўга не пратрымаліся і разбеглі ся. А потым кажуць: не сышліся характарамі.

— І што ж можа іх падштурхнуць змяніцца? Што наогул можа змякчыць чалавечае сэрца, душу?

— Прыклад нам даў Хрыстос Збавіцель. У хрысціян ёсць прыклад, да якога мы павінны імкнуцца. Гэта Збавіцель свету — Ісус Хрыстос. Апостал Павел аднойчы выказаў выдатную думку: «Пераймайце мяне, як я — Хрыста» (1 Кар. 4,16). І для апостала Паўла Ісус Хрыстос быў узорам для пераймання. Рэкамендую ўсім часцей чытаць Евангелле. Яно дапаможа нам раскрыць глыбіню і сэнс чалавечага жыцця на зямлі. Там — адказы на ўсе нашы пытанні...

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by

■ Кніжная паліца

ШЛЯХ ДА НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

Пабачыла свет сумеснае выданне гісторыкаў Ігара Пушкіна і Аляксандра Агеева, прысвечанае дзейнасці першай беларускай арганізацыі ў Магілёве

Сёлета спаўняецца сто гадоў з моманту стварэння Магілёўскага беларускага камітэта, які адыграў значную ролю ў грамадскім жыцці таго перыяду. На 288 старонках выкладзены рэдкі факталагічны матэрыял, унікальныя здымкі першакрыніц. Кніга ўжо паспела стаць гістарычным бестселерам. Бо на сённяшні дзень гэта адзінае падрабязнае апісанне тых падзей, якія адбываліся ў Магілёве на працягу года існавання камітэта.

— Мы зараз шмат кажам аб самаідэнтыфікацыі беларусаў, а гэта былі першыя спробы зрабіць краіну незалежнай. Беларуская дзяржаўнасць пачынаецца з моманту правядзення Першага Усебеларускага з'езда ў Мінску ў снежні 1917 года, але мала хто ведае, што спачатку планавалі гэты ўсебеларускі з'езд (у кнізе прыведзены пацвярджальныя дакументы) правесці ў Магілёве. Гэта ідэя аб'яднала ўсіх жыхароў горада. Магілёў стаў другім пасля Мінска горадам Беларусі, які падтрымаў ідэю самастойнасці нашай дзяржавы, — адзначае **дацэнт кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін МДУ імя А. А. Куляшова Аляксандр АГЕЕЎ.**

— Шлях да нашай незалежнасці пачынаўся менавіта тады, сто гадоў таму, — дадае **кандыдат гістарычных навук, дацэнт Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання Ігар ПУШКІН.** — І ў гэтым кантэксце нам было асабліва цікава працаваць над кнігай. Беларусы, яўрэі, рускія, палякі прагаласавалі за стварэнне сваёй дзяржавы. Гэта ўсё адбывалася ва ўмовах грамадзянскай вайны, нестабільнасці. Цікавымі былі іх адносіны да беларускай мовы. Яны былі за тое, каб на ёй размаўлялі, праводзілі культурна-асветніцкія мерапрыемствы.

Аўтары манаграфіі на працягу некалькіх гадоў збіралі матэрыялы ў дзяржаўных архівах Мінска, Магілёва, Вільнюса, Масквы. Большую частку копій рэдкіх дакументаў яны перадалі музею гісторыі Магілёва. Гісторыкі ўдзячныя жыхарам Магілёва за цікавасць да тэмы, гэта, кажуць яны, прымушала іх працаваць у паскораным тэмпе. Знаходзіліся добрыя людзі, якія дапамагалі з часовым пражываннем у Мінску і Вільнюсе, садзейнічалі ў адкрыцці візы, прапаноўвалі транспарт. Атрымалася нешта накшталт сумеснай грамадскай акцыі. На жаль, тыраж кнігі абмежаваны, таму купіць яе будзе складана. Затое яе можна знайсці ў бібліятэках.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

Дзяды твае жывуць не ў занябессі.
Навошта ім халодныя вышыні?
Яны зышліся у спрадвечным лесе,
Дзе цар-дубы ды цнотныя шыпшыны.

Там птах дзядам пра любы край спявае,
Там з-пад ігліцы ручаінка льецца...

Куды ж ты пойдзеш ад зямлі, якая
Сілкуе успамінам тваё сэрца?..

Дзяды нябачна ўсюды крочаць з намі,
Нячутна ўсюды з намі размаўляюць -
Мінулае працялі каранямі
І ў вершалінах новы дзень люляюць.

5 июля 2017 года в 15.30 в малом зале Гомельского районного исполнительного комитета, расположенного по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 51а, состоится аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков, расположенных на территории Улуковского сельсовета

№ лота	Кадастровый номер и адрес земельного участка, его размеры, целевое назначение, назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества	Срок аренды (лет)	Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений	Начальная цена предмета аукциона	Затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, подлежащие возмещению победителем аукциона	Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета
1	321089206601000658, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) площадью 0,1276 га. Гомельская область, Гомельский район, Улуковский с/с, д. Романовичи, ул.Садовая, У-1. Имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель. Виды ограничений (обременений) прав: земельный участок, расположенный в водоохранных зонах рек и водоемов, код – 2,4, площадь – 0,1276 га	99	Имеется возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению, водопроводу. Дорога в грунтовом исполнении	10 115,95 рублей	Расходы в сумме 1 422,84 рублей и расходы, связанные с опубликованием объявления	Задаток в сумме 1 011,60 рублей на р/с 3641414220021 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501664, **получатель –** Улуковский сельский исполнительный комитет, код платежа 04002
2	321089206601000659, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) площадью 0,1191 га. Гомельская область, Гомельский район, Улуковский с/с, д. Романовичи, ул. Молодежная, У-1. Имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель. Виды ограничений (обременений) прав: земельные участки, расположенные в водоохранных зонах рек и водоемов, код – 2,4, площадь – 0,1191 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадь – 0,0071 га	99	Имеется возможность подключения к электроснабжению, газопроводу, водопроводу. Дорога в грунтовом исполнении	9 553,46 рублей	Расходы в сумме 1 389,85 рублей и расходы, связанные с опубликованием объявления	Задаток в сумме 955,35 рублей на р/с 3641414220021 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501664, **получатель –** Улуковский сельский исполнительный комитет, код платежа 04002
3	321089200601000555, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) площадью 0,1181 га. Гомельская область, Гомельский район, Улуковский с/с, д. Березки, ул. Ягодная, У-115. Имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель. Виды ограничений (обременений) прав: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадь – 0,0121 га	99	Имеется возможность подключения к электроснабжению. Дорога в щебеночно-песчаном исполнении	4 412,57 рублей	Расходы в сумме 1 577,47 рублей и расходы, связанные с опубликованием объявления	Задаток в сумме 441,26 рублей на р/с 3641414220021 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501664, **получатель –** Улуковский сельский исполнительный комитет, код платежа 04002
4	321089201601000501, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) площадью 0,1500 га. Гомельская область, Гомельский район, Улуковский с/с, д. Головинцы, ул. Советская, У-1. Имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель. Виды ограничений (обременений) прав: земельные участки, расположенные в водоохранных зонах рек и водоемов, код – 2,4, площадь – 0,1500 га	99	Имеется возможность подключения к электроснабжению. Дорога в грунтовом исполнении	4 265,15 рублей	Расходы в сумме 1 398,14 рублей и расходы, связанные с опубликованием объявления	Задаток в сумме 426,52 рублей на р/с 3641414220021 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501664, **получатель –** Улуковский сельский исполнительный комитет, код платежа 04002

Заявления об участии в аукционе и прилагаемые к ним документы принимаются по адресу: Гомельский район, агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а, каб. 6, с даты опубликования по 30.06.2017 с 8.30 до 17.30, обед – с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье

Условия участия в аукционе.

Аукцион проводится при наличии не менее двух участников.

Для участия в аукционе гражданин (лично либо через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключает с Улуковским сельским исполнительным комитетом соглашение установленной формы.

Кроме того, в комиссию представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют документ, удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию или организацию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении о проведении аукциона, а также заключившие соглашение.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из предметов аукциона.

После получения необходимых документов от гражданина на участие в аукционе комиссия выдает ему билет участника аукциона с указанием даты регистрации заявления и номера, под которым он будет участвовать в аукционе. Данные о каждом участнике аукциона заносятся в книгу регистрации участников аукциона.

Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать заявление об участии в нем. Неявка участника аукциона на аукцион приравнивается к письменному отзыву заявления об участии в нем. При этом участнику аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона возвращается сумма внесенного им задатка (задатков).

Письменный отзыв заявления или неявка участника аукциона на аукцион регистрируется в книге регистрации участников аукциона.

Прием заявлений об участии в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленный комиссией или организацией день и час, но не ранее чем за 3 рабочих дня до даты проведения аукциона. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в комиссии или организации.

Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

Перед началом аукциона его участники обязаны зарегистрироваться в комиссии и обменять билеты участников аукциона на аукционные номера, которые возвращаются в комиссию после окончания аукциона.

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

1. в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся:

1.1. внести плату за право заключения договора аренды земельного участка;

1.2. возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документов, необходимых для его проведения, формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка;

2. заключить с сельисполкомом договор аренды земельного участка и в течение двух месяцев со дня его подписания, но не позднее трех месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона обратиться в Гомельский межгородской филиал республиканского унитарного предприятия «Гомельское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него (г. Гомель, ул. Войкова, 87);

3. выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в аренду победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

Участникам предоставляется возможность осмотра земельного участка на местности с членами комиссии (по предварительному согласованию).

Справки по адресу: Гомельский район, агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а, тел.: 936-275, 937-290.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

извещает о повторном открытом аукционе (цена снижена) по продаже имущества должника (здание насосной станции «Сигма 3», здание склада насосной станции «Сигма 3», здание складского помещения, расположенные по адресу: Минская обл., Смолевичский район, Драчковский с/с)

Наименование	Начальная цена продажи, бел. руб.	Задаток, бел. руб.
Лот №1. Капитальное строение с инв. №614/С-38318. Здание насосной станции «Сигма 3». Адрес объекта: Минская обл., Смолевичский район, Драчковский с/с, 1. Составные части – навес, забор, ворота, площадка. Назначение – здание специализированное коммунального хозяйства. Г. п. – 1982. Этажность – 1. Общая площадь – 215,3 кв. м. Фундамент – бетонный. Стены наружные и внутренние – кирпичные. Перегородки – кирпичные. Перекрытия – ж/б. Крыша – рулонно-битумное покрытие. Полы – бетонные. Проемы – деревянные. Внутренняя отделка – оштукатурено. Водопровод, канализация – есть. Электроснабжение – нет. Вентиляция – естественная. На праве хозяйственного ведения	58 002,02	5 800,00
Лот №2. Капитальное строение с инв. №614/С-38314. Здание склада насосной станции «Сигма 3». Адрес объекта: Минская обл., Смолевичский район, Драчковский с/с, 1/1. Составные части – навес. Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Г. п. – 1983. Этажность – 1. Общая площадь – 87,4 кв. м. Фундамент – бетонный. Стены наружные и внутренние – кирпичные. Перегородки – кирпичные. Перекрытия – ж/б. Крыша – рулонно-битумное покрытие. Полы – бетонные. Проемы дверные – металлические. Электроснабжение – есть. Вентиляция – естественная. На праве хозяйственного ведения	13 492,68	1 340,00
Лот №3. Капитальное строение с инв. №614/С-38315. Здание складского помещения. Адрес объекта: Минская обл., Смолевичский район, Драчковский с/с, 1/2. Составные части – пристройка, бассейн, три крыльца. Назначение – здание административно-хозяйственное. Г. п. – 1983. Этажность – 1. Общая площадь – 99,3 кв. м. Фундамент – бетонный. Стены наружные и внутренние – сборно-щитовые. Перегородки – дощатые с проемами. Перекрытия – деревянные. Крыша – асбесто-цементные листы. Полы – дощатые, плитка. Проемы – деревянные. Наружная отделка – облицовка кирпичом. Внутренняя отделка – оклейка обоями, вагонка. Отопление – печное, водяное от индивидуального котла. Водопровод, канализация – есть. Электроснабжение – скрытая проводка. Вентиляция – естественная. На праве хозяйственного ведения	8 289,50	820,00
СВЕДЕНИЯ О ЗЕМЕЛЬНОМ УЧАСТКЕ		
Лоты №1, №2 и №3 расположены на земельном участке с кадастровым номером 624880800027000056. Адрес: Минская обл., Смолевичский район, Драчковский с/с, в районе аг. Драчково. Пл. 0,5839 га. Назначение – земельный участок для обслуживания насосной станции «Сигма 3». На праве постоянного пользования. Ограничения (обременения) прав на земельные участки: расположенные в водоохранных зонах водных объектов, площадь 0,5839 га; расположенные в охранных зонах линий электропередачи, площадь 0,1140 га. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь		
УСЛОВИЯ		
1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – (Претендент на покупку), обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) не позднее 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. 2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. 3. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект (Объекты) недвижимости, имущество должника, осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь. 4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона		
Аукцион состоится 28.06.2017 г. в 11.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 4. Шаг аукциона – 5%		
Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества должника (Лот №___), проводимом 28.06.2017 (Борисовский МРО). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в г. Минске, ул. Комсомольская, 11, каб. 6 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00. Окончание приема заявлений – 26.06.2017 в 11.00. Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона, согласовав время осмотра по телефонам: 8 (029) 360-14-91, 8 (029) 695-33-84		
Контакты организатора аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 550 09 59, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • torgi@ino.by		

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

извещает о повторном открытом аукционе (цена снижена) по продаже 5 машино-мест в г. Минске по ул. Платонова, 1Б

Наименование	Начальная цена продажи, бел. руб.	Задаток, бел. руб.
Лот №1. Изолированное помещение с инв. №500/D-708123686. Наименование: машино-место №17. Адрес: г. Минск, ул. Платонова, 1Б-80. Г. п. – 2007. Этаж – 1-подземный уровень. Общая площадь – 16,1 кв. м. Ограждающие конструкции – разметка. Материал покрытия – бетон	13 219,20	1 320,00
Лот №2. Изолированное помещение с инв. №500/D-708123687. Наименование: машино-место №18. Адрес: г. Минск, ул. Платонова, 1Б-81. Г. п. – 2007. Этаж – 1-подземный уровень. Общая площадь – 17,6 кв. м. Ограждающие конструкции – разметка. Материал покрытия – бетон	14 385,60	1 430,00
Лот №3. Изолированное помещение с инв. №500/D-708123688. Наименование: машино-место №19. Адрес: г. Минск, ул. Платонова, 1Б-82. Г. п. – 2007. Этаж – 1-подземный уровень. Общая площадь – 17,3 кв. м. Ограждающие конструкции – разметка. Материал покрытия – бетон	14 191,20	1 410,00
Лот №4. Изолированное помещение с инв. №500/D-708123689. Наименование: машино-место №20. Адрес: г. Минск, ул. Платонова, 1Б-83. Г. п. – 2007. Этаж – 1-подземный уровень. Общая площадь – 15,2 кв. м. Ограждающие конструкции – разметка. Материал покрытия – бетон.	12 441,60	1 240,00
Лот №5. Изолированное помещение с инв. №500/D-708123690. Наименование: машино-место №21. Адрес: г. Минск, ул. Платонова, 1Б-84. Г. п. – 2007. Этаж – 1-подземный уровень. Общая площадь – 14,9 кв. м. Ограждающие конструкции – разметка. Материал покрытия – бетон	12 247,20	1 220,00
УСЛОВИЯ		
1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – (Претендент на покупку), обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) не позднее 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. 2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. 3. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект (Объекты) недвижимости, имущество должника, осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь. 4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона		
Аукцион состоится 21.06.2017 г. в 11.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 4. Шаг аукциона – 5%		
Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется: на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель - РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Машино-место №___) (Лот №____), проводимом 21.06.2017 (Партизанский МРО). Участник аукциона, желающий принять участие в аукционе по нескольким лотам, вносит задаток в сумме, предусмотренной для каждого лота. Организация и проведение аукциона, а также оформление и регистрация сделки осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в г. Минске, ул. Комсомольская, 11, каб. 7 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00. Окончание приема заявлений – 19.06.2017 в 11.00. Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом(ами) аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: Сувалов Юрий Петрович, тел.: 8 (029) 140-83-10, 8 (017) 290-93-46 (47).		
Контакты организатора аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 550 09 59, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • torgi@ino.by		

ЗАСО «ПРОМТРАНСИНВЕСТ»

предлагает принять участие в процедуре переговоров по выбору подрядных организаций по объектам «Текущий ремонт входной группы и помещений центра оказания страховых услуг представительства ЗАСО «Промтрансинвест» в г. Жлобине по адресу: г. Жлобин, ул. Первомайская, 52» и «Текущий ремонт пожарной сигнализации в помещении представительства ЗАСО «Промтрансинвест» в г. Жлобине по адресу: г. Жлобин, ул. Первомайская, 52». Документацию для переговоров можно получить при обращении по телефону (017) 228 14 69.

УНП 100357923

БЯСЦЭННЫ ДАР І ВЯЛІКАЯ АДКАЗНАСЦЬ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«Чалавек і прырода: яднанне ў горадзе, на зямлі, ад полюсаў да экватара» — так гучыць тэма Сусветнага дня навакольнага асяроддзя — 2017, які адзначаецца 5 чэрвеня.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сярод прыярытэтных напрамкаў дзейнасці Мінприроды — эканамічнае стымуляванне, павышэнне інвестыцыйнай прывабнасці, паляпшэнне якасці і эфектыўнасці інспектарскай дзейнасці, прасоўванне прынцыпаў зялёнай эканомікі ва ўсе галіны народнай гаспадаркі.

Спецыялісты ведамства таксама займаюцца прапрацоўкай падыходаў да кадыфікацыі заканадаўства аб абыходжанні з адходамі, а таксама распрацоўваюць канцэпцыю праекта Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ахове і выкарыстоўванні балот (тарфянікаў)».

Актуальнае сёння пытанне і экалагічнай сертыфікацыі. Стандарты ISO 14000 па ахове навакольнага асяроддзя і экалагічным менеджменце павінны стымуляваць вытворцаў вырашаць праблемы ў гэтай сферы на сістэмнай аснове, гарантуючы спажыўцам іх экалагічную бяспеку і адначасова павышаючы канкурэнтаздольнасць прадукцыі на сусветных рынках. Заканадаўствам ужо прадугледжаны падатковыя прэферэнцыі для развіцця сертыфікацыі, але шмат чаго яшчэ давядзецца зрабіць у гэтым кірунку.

Мы таксама працягваем працаваць і над павышэннем экалагічнай і прававой культуры насельніцтва, прыцягненнем увагі грамадскасці да надзённых экалагічных пытанняў, у тым ліку праз правядзенне грамадскіх абмеркаванняў.

— Адным з пытанняў, якія абмяркоўваліся падчас XIV Рэспубліканскага экалагічнага форуму, было магчымае далучэнне Беларусі да Гётэборгскага пратакола. Гэта дапаможа зрабіць паветра над краінай больш чыстым?

— Забруджанае паветра не мае межаў. Яно аказвае шкоднае ўздзеянне на здароўе людзей, уплывае на харчовую бяспеку, ускладняе эканамічнае развіццё, садзейнічае змяненню клімату і пагаршае стан навакольнага асяроддзя. У Еўропе эканамічныя выдаткі, звязаныя з уздзеяннем забруджвальных рэчываў на здароўе людзей і экасістэмы, у 2015 годзе склалі 1,6 трыльёна долараў.

Гётэборгскі пратакол па барацьбе з падкісленнем, эўтрафікацыяй і прыземным азонам — самы комплексны пратакол да Канвенцыі аб трансгранічным забруджванні паветра на вялікіх адлегласцях. Ён устанаўлівае абмежаванне выкідаў пяці асноўных забруджвальных рэчываў: дыяксіду серы, аксідаў азоту, лятучых арганічных злучэнняў, цвёрдых часціц і аміяку — як для асобных крыніц, так і для тэхналагічных працэсаў.

Выкіды злучэнняў серы і азоту, а таксама ўтварэнне прыземнага азону ўздзейнічаюць на здольнасць экасістэм функцыянаваць і развівацца. Дыяксід серы і аксіды азоту, трапляючы ў выглядзе кіслотных дажджоў у ваду, глебу і на расліны, павялічваюць іх кіслотнасць і аказваюць шкоднае ўздзеянне на біяразнастайнасць.

Небяспека лятучых арганічных злучэнняў абумоўлена іх таксічнасцю і здольнасцю ўтвараць фотахімічныя акісляльнікі ў рэакцыі з вокісламі азоту пры наяўнасці сонечнага святла, у прыватнасці ўдзельнічаць ва ўтварэнні азону. Павышэнне канцэнтрацыі азону ў прыземным слоі вядзе да пашкоджання клеткавых мембран у раслін, што запавольвае важнейшыя працэсы, неабходныя для іх росту і развіцця, памяншае плошчу расліннага покрыва і змяншае яго здольнасць фільтраваць і чысціць паветра.

Эўтрафікацыя — працэс назапашвання пажыўных рэчываў, уключаючы азот, у водных аб'ектах, што з'яўляецца вынікам забруджвання паветра. Лішак пажыўных рэчываў у водных экасістэмах выклікае цвіценне водарасцяў і, у выніку, скарачэнне колькасці кісларoду і зніжэнне колькасці жывых арганізмаў.

Выкананне абавязацельстваў па абмежаванні выкідаў шкодных рэчываў да 2020 года, якія бакі Канвенцыі бяруць на сябе, дазволіць значна скараціць плошчу «забруджаных» тэрыторый, што істотна павялічыць харчовую бяспеку. У выніку колькасць заўчасных смерцяў ад прысутнасці азону і цвёрдых часціц у паветры скароціцца прыкладна на 47 тыс. у год. Не менш чым у два разы зменшацца і эканамічныя выдаткі ў Еўропе, і рост ВУП за кошт паляпшэння здароўя людзей і якасці экасістэм можа скласці да 10% да 2020 года.

Таму далучэнне Беларусі да Гётэборгскага пратакола, а пасля і выкананне яго абавязацельстваў будзе не толькі спрыяць паляпшэнню навакольнага асяроддзя, але і пацягне за сабой сукупныя выгады — паляпшэнне здароўя людзей, павелічэнне харчовай бяспекі і стымуляванне эканамічнага развіцця.

— Беларусь славіцца не толькі сваімі рэкамі і азёрамі, але і значнымі запасамі падземных вод. Ці атрымліваецца захаваць у чысціні гэты каштоўны прыродны рэсурс?

— Сапраўды, наша краіна валодае значным рэсурсным патэнцыялам прэсных падземных вод, які складае 49596 тыс. м³/суткі. У цяперашні час на тэрыторыі Беларусі разведана 370 радовішчаў з эксплуатацыйнымі запасамі прэсных падземных вод у колькасці 6,6 млн м³/суткі. Фактычна ж здабываецца каля 2,8 млн м³/суткі.

Асноўная частка падземных вод (больш за 60%) здабываецца на водазаборах і буйных прадпрыемствах, якія прайшлі дзяржаўную экспертызу запасаў, строга вытрымліваюць тэхналогію здабычы, сочаць за чысцінёй падземных вод.

У той жа час прыватным асобам і арганізацыям дадзена для ўласных патрэб (без атрымання камерцыйнай выгады) права карыстання падземнымі водамі з першага воданапорнага гарызонту ў межах вылучаных зямельных участкаў без праходжання дзяржаўнай экспертызы.

Паводле маніторынгу, істотных змен якасці падземных вод не назіраецца. У той жа час такія значныя аб'ёмы іх здабычы адзінкавымі свідравінамі патрабуюць пастаяннага кантролю за выкананнем патрабаванняў у частцы бурэння свідравін, мер, якія прымаюцца для аховы падземных вод.

— Нядаўна спецыялісты Мінприроды загаварылі пра стварэнне ў Беларусі экспертнай сістэмы рэабілітацыі забруджанага нафтапрадуктамі геалагічнага асяроддзя. Якая яе асноўная мэта?

— Ачыстка геалагічнага асяроддзя ад забруджання нафтапрадуктамі — прыярытэтная праблема для ўсіх узроўняў прыродакарыстання ў краінах СНД. Для Беларусі яна, на шчасце, не настолькі сур'ёзная. Тым не менш у выпадку аварый і катастроф спецыялісты павінны аператыўна атрымліваць патрэбную інфармацыю — у неабходных формах, з улікам узроўняў рэагавання і зменлівай сітуацыі. Дзеля гэтага распрацоўваюць планы ліквідацыі аварыйных разліваў нафты і нафтапрадуктаў. А ў якасці эфектыўнага сродку падтрымкі прыняцця рашэнняў у крызісных сітуацыях прапануецца выкарыстоўваць спецыялізаваную экалагічную экспертную сістэму.

Рэсурсы пад нагамі

— У Беларусі сёння збіраецца некалькі відаў небяспечных адходаў. Як вырашаецца праблема з іх перапрацоўкай?

— Сёння ў краіне наладжаны збор адпрацаваных акумулятараў, батарэек, ртуцьзмяшчальных адходаў. Арганізоўваючы сістэму іх збору, безумоўна, неабходна было вызначыць і месца іх перапрацоўкі. Так, на сёння функцыянуюць пяць прадпрыемстваў па перапрацоўцы ртуцьзмяшчальных адходаў. Акрамя таго, створана ўласная вытворчасць па перапрацоўцы адпрацаваных элементаў сілкавання на базе ААТ «БелВТІ». Пакуль у цэху ажыццяўляецца толькі ручное сартаванне батарэек, бо патрабуецца з агульнай масы адабраць небяспечныя віды (15—20%), аднак у перспектыве плануецца ўтылізаваць да 200—300 тон адпрацаваных элементаў сілкавання ў год.

Прыватным асобам і арганізацыям дадзена для ўласных патрэб (без атрымання камерцыйнай выгады) права карыстання падземнымі водамі з першага воданапорнага гарызонту ў межах вылучаных зямельных участкаў без праходжання дзяржаўнай экспертызы.

Стварацца падобныя вытворчасці па перапрацоўцы небяспечных адходаў у краіне неабходна і выгадна. Перапрацоўваючы такія адходы, прадпрыемствы атрымліваюць чорныя і каляровыя металы, ртуць, шкло, якія з'яўляюцца каштоўнай сыравінай для далейшага выкарыстання ў прамысловасці.

Такім чынам, выкідваючы батарэйкі і акумулятары ў спецыяльны кантэйнер, мы не толькі прадухіляем пападанне небяспечных рэчываў у навакольнае асяроддзе, але і спрыяем максімальнаму ўцягванню адходаў у другаснае выкарыстанне.

Паступова вырашаецца ў краіне і праблема стойкіх арганічных забруджвальнікаў. Ідзе распрацоўка праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі па абыходжанні з САЗамі, адным з вынікаў яго рэалізацыі павінна стаць будаўніцтва на тэрыторыі Беларусі завода па абясшкоджванні САЗаў.

— Якія, на ваш погляд, перспектывы выкарыстання ўзнаўляльных крыніц энергіі ў ацяпляльнай, транспартнай сістэме краіны?

— У Беларусі створана спрыяльная аснова для развіцця ўзнаўляльнай энергетыкі. За апошнія пяць гадоў назіраўся пастаянны рост долі ўзнаўляльных крыніц энергіі ў сумарным аб'ёме энергаспажывання.

Сёння ў краіне эксплуатуецца 2646 установак з выкарыстаннем энергіі сонца, ветру, цяпла зямлі, біягазу, натуральнага руху водных патокаў, драўнянага паліва, іншых відаў біямасы сумарнай магутнасцю 1218 МВт.

Рост долі мясцовых відаў паліўна-энергетычных рэсурсаў і ўзнаўляльных крыніц энергіі ў балансе кацельна-пячнога паліва дазволіў паменшыць аб'ёмы імпарту энерганосьбітаў, а таксама надаць дадатковы імпульс развіццю перспектыўных кірункаў у вобласці энергетыкі.

У выніку не толькі скараціліся выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра і энергазалежнасць, але і за кошт захавання фінансавых рэсурсаў унутры краіны дасягнуты дадатковы эканамічны эфект (павелічэнне працоўных месцаў, стварэнне новых высокатэхналагічных вытворчасцяў і інш.).

Пераход на нізкавугляроднае развіццё, у тым ліку за кошт павышэння выкарыстання ўзнаўляльных крыніц энергіі, з'яўляецца адным з кірункаў рэалізацыі Парыжскага пагаднення Рамачнай канвенцыі ААН аб змяненні клімату, да якога Беларусь далучылася ў 2016 годзе.

Дасягненні ў вобласці тэхналогіі выкарыстання ўзнаўляльных крыніц энергіі на працягу апошніх пяці гадоў прывялі да таго, што праекты па УКЭ сталі эканамічна мэтазгоднымі без субсідый, і кошт укаранення такіх крыніц зраўняўся з коштам будаўніцтва крыніц на выкапнёвым паліве.

Улічваючы сусветныя тэндэнцыі, у Беларусі непазбежна развіццё электратранспарту і павелічэнне выкарыстання ўзнаўляльных крыніц энергіі, перш за ўсё ва ўласных хатах для мэт ацяплення і гарачага водазабеспячэння.

Добры прыклад варты пераймання

— За апошнія гады ў краіне пры фінансавай падтрымцы ПРААН было рэалізавана некалькі пілотных экалагічных праектаў. Наколькі эфектыўнымі яны аказаліся?

— З дапамогай многіх з іх удалося мадэрнізаваць прадпрыемствы, палепшыць экалагічнае становішча ў рэгіёне, павялічыць аб'ём выкарыстання другасных рэсурсаў, стварыць новыя працоўныя месцы. Цяпер рэалізуецца праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі ЕС/ПРААН «Садзейнічанне пераходу Рэспублікі Беларусь да «зялёнай» эканомікі», які ажыццяўляе практычныя меры па «азеляненні» асобных тэрыторый, вытворчасцяў на прыкладзе больш як 20 пілотных ініцыятыў.

Так, дзякуючы ўстаноўцы на ВКУП «Камунальнік» (г. Брэст) комплексу абсталявання для драбнення драўняных адходаў у шчапу і наступнага выкарыстання атрыманага біяпаліва ў кацельні, толькі за верасень — лістапад 2016 года ўдалося выратаваць ад пахавання на палігоне і перапрацаваць 200 м³ пнёў і ствалоў і 9000 м³ галін. За гэты ж перыяд рэнтабельнасць вытворчасці драўняных адходаў у біяпаліва склала 160%. У выніку рэалізацыі пілотнай ініцыятывы плануецца ліквідаваць кар'ер па захаванні драўняных адходаў, а таксама спыніць практыку перадачы такіх адходаў на палігоны па захаванні ЦКА.

Дзякуючы рэалізацыі праекта «Кліма-Іст» па захаванні і ўстойлівым кіраванні тарфянікамі, які сёлета падыходзіць да завяршэння, знойдзена выдатнае рашэнне праблемы зарастання балот. Сёння тэхніка для кашэння і перапрацоўкі хмызнякоў і трыснягу выкарыстоўваецца ў Брэсцкай вобласці. Але такія зараснікі сустракаюцца і на Віцебшчыне. Таму сёння мы актыўна супрацоўнічаем з айчыннымі вытворцамі, якія выпускаюць падобную тэхніку. Магчыма, менавіта беларускія распрацоўкі дапамогуць аднавіць натуральны выгляд балот у іншых рэгіёнах краіны.

— Лета — традыцыйны час для адпачынку беларусаў і павышанай увагі замежных гасцей да цікавых мясцін, у тым ліку і асабліва ахоўных прыродных тэрыторый. Ці атрымліваецца ўтрымаць баланс паміж павышэннем узроўню экалагічнага турызму і выкананнем экалагічнага заканадаўства?

— Асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі — прыродны каркас Беларусі. Менавіта яны прадстаўляюць найбольшы інтарэс як для аматараў летняга адпачынку на прыродзе, так і турыстаў, якія наведваюць запаведнікі, нацыянальныя паркі і заказнікі для вывучэння прыроднай і культурнай спадчыны нашай краіны.

Экалагічны турызм — адзін з элементаў устойлівага выкарыстання прыродных рэсурсаў і захавання навакольля, магутны адукацыйны інструмент, а таксама важкі аргумент супраць спроб уцягнуць прыродныя рэсурсы запаведных тэрыторый у іншыя формы гаспадарчай дзейнасці.

Сёння рэкрэацыйны патэнцыял большасці прыродных тэрыторый выкарыстоўваецца менш чым на трэць, аднак на некаторых з іх назіраецца перавышэнне дапушчальных рэкрэацыйных нагрузак у 1,5—3 разы. Асабліва актуальная гэта праблема для заказніка «Свіцязянскі».

Але рэгуляваць рэкрэацыйную нагрузку магчыма — праз раўнамернае размяшчэнне на тэрыторыі турыстычных маршрутаў, стаянак, экалагічных сцежак. Напрыклад, у нацыянальным парку «Белавежская пушча» стварылі два новыя турыстычныя комплексы, якія дазволілі «разгрузіць» цэнтральную сядзібу і прылеглую да яе тэрыторыю. Для раўнамернага размеркавання рэкрэацыйнай нагрузкі нацыянальны парк «Браслаўскія азёры» актыўна развівае сетку турыстычных стаянак.

* * *

Напрыканцы хачу дадаць, што ўстойлівае развіццё, будучы па сваёй прыродзе працэсам глабальным, немагчымае без шырокага, цеснага міжнароднага супрацоўніцтва. Наша планета занадта малая, каб дабрабыт адных дзяржаў захоўваўся пры ігнараванні праблемы іншых. Калі кожны з нас будзе лічыць сваім абавязкам берагчы тое, што дадзена нам прыродай, а таксама прызнае сябе адказным за будучыню нашай планеты, мы даб'ёмся поспеху ў захаванні нашага агульнага дому для наступных пакаленняў.

Гутарыла Вераніка КОЛАСАВА.
kolasava@zviazda.by

У сярэдзіне чэрвеня ў Мінску адбудзецца Канферэнцыя бакоў Канвенцыі аб ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе ў трансгранічным кантэксце. Правядзенне ў беларускай сталіцы гэтага значнага палітыка-экалагічнага мерапрыемства — вынік актыўнай працы ў сферы развіцця міжнароднага супрацоўніцтва.

■ Асоба

Андрэй ДЗІЧЭНКА:

«Раней як агню баяўся пісаць ад першай асобы»

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Перамога ў літаратурным конкурсе, атрыманне прэміі можа стаць выдатным стартам для літаратара, а таксама паспрыяць больш шырокай вядомасці яго імя. Наш сённяшні суразмоўнік у літаратуры працуе досыць даўно, але, бадай, толькі летась і сёлета яго імя пачало ўсё часцей з'яўляцца на старонкай айчынных СМІ. Знаёмцеся: празаік Андрэй ДЗІЧЭНКА.

— Летась твая кніга апавяданняў стала шорт-лістарам прэміі «Дэбют», ты сам перамог з адным з апавяданняў у конкурсе «Звязды». Што значаць гэтыя перамогі?

— Напэўна, пашырэнне меж беларускай літаратуры. У культурным асяроддзі яшчэ даўнымдаўно склалася адчуванне, што літаратурныя прэміі атрымліваюць толькі пісьменнікі, груба кажучы, з «тусоўкі». Аднак цяпер усё інакш. Ні я, ні Садоўскі, ні Горват — іншыя шорт-лістары «Дэбюту» — да тусовак не належаць. Відавочна, што мы трое — абсалютна розныя. Больш за тое — зусім адзін аднаму супрацьлеглыя. І ўва мне крыецца надзея, што ўсё гэта ў выніку ператворыцца ў нешта глабальнае і эксперыментальнае.

Хочацца ўбачыць дыялог, у якім не будзе аніякіх межаў. Хочацца нейкіх больш шырокіх эксперыментаў. Хочацца, каб беларуская літаратура згубілася ў геаграфіі і стала чымсьці звышчалавечым. Упэўнены, што мы ўсе гэтага хочам аднолькава моцна. Перш-наперш запоўніць культурныя нішы, а потым адправіцца ў агрэсіўны экспарт, калі можна так сказаць. Бо працэс ёсць і тут. Цікава, як ён выглядае, калі на яго глядзяць іншымі вачыма. Напрыклад, еўрапейцаў або азіатаў.

«Я паважаю кожнага чытача і сам такі ж самы чытач. Напэўна, больш чытач, чым пісьменнік. Радуе, што падчас гутарак атрымліваецца знайсці агульную мову, нейкія агульныя інтарэсы».

Што датычыцца конкурсу апавяданняў «Звязды», то ў гэтым крыецца заклік больш увагі звяртаць на друкаванае слова. Інтэрнэт, гэта, вядома ж, вельмі добра. Але ён ніколі не будзе мець той сілы, якую мае газета са стагадовай гісторыяй. Быць датычным да выдання, праз якое прайшлі сотні культавых людзей, вялікі гонар. Дзякуючы гэтаму ты цалкам заслужана можаш адчуць сябе часткай культурнага працэсу, а не яго пустэльнікам.

— Ведаю, што ўжо гатовая новая кніга. Чым яна адрозніваецца ад папярэдняга зборніка апавяданняў «Сонечны чалавек»?

— «Сонечны чалавек» пазбаўлены прысутнасці маёй асобы ў тэкстах. Гэта значыць там усё старонняе, якое з маім жыццём ніяк не перасякаецца. Новая кніга — «Ядро матэрыі» будзе куды больш патаемнай. І гэта наогул першая праца, якая будзе пісацца ад першай асобы. Раней баяўся гэтага як агню. Цяпер, напэўна, прыйшоў час выкарыстоўваць гэтую стылістыку. Што датычыцца сюжэта, то магу толькі сказаць, што ён будзе пра эпідэмію СНІДу ў маленькім беларускім мястэчку. «Сонечны чалавек» складзены цалкам з маленькіх апавяданняў. Тут фармат будзе яшчэ больш мініяцюрны. Сотні маленькіх фрагментаў павінны будуць стварыць атмасферу. Але зноў жа, гэта я так бачу. Як убачаць астатнія, стане зразумела потым. Другая аповесць у кнізе яшчэ больш складаная. Калі ў «Ядра» яшчэ будзе нейкі сюжэт, то ў аповесці «О.» я вырашыў завязаць з сюжэтам. Тут прамы ўплыў Бэкета. У апошні час толькі і раблю, што чытаю яго тэксты.

— Усе гэтыя дыпломы-перамогі нейкім чынам паўплывалі на тваю творчасць? Ты стаў больш вядомым?

— Гэта так, такое ёсць. Але яны хутчэй дапамагаюць паверыць навакольным людзям, што я не проста шалёны юнак, а чалавек, які любіць літаратуру і хоча ёй займацца. Не скажу, што гэта атрымліваецца ў мяне добра. Тут як з задумкай карціны і самой карцінай. Не заўсёды атрымліваецца адлюстраваць тое, што ты бачыш у асабістых глыбінях. Ну і яшчэ ўсе гэтыя ўзнагароды вельмі радуюць маіх бацькоў. А калі казаць увогуле, то ў мяне няма такога фетыша, каб збіраць граматы.

«Хочацца ўбачыць дыялог, у якім не будзе аніякіх меж. Хочацца нейкіх больш шырокіх эксперыментаў. Хочацца, каб беларуская літаратура згубілася ў геаграфіі і стала чымсьці звышчалавечым».

— Ты зараз удзельнічаеш у прэзентацыях у розных гарадах краіны. Як несталічная публіка ўспрымае твае творы?

— У цэлым добра. Таму што я паважаю кожнага чытача і сам такі ж самы чытач. Напэўна, больш чытач, чым пісьменнік. Радуе, што падчас гутарак атрымліваецца знайсці агульную мову, нейкія агульныя інтарэсы. Ды і што тут казаць, я ж сам чалавек, па сутнасці, з глыбінкі. Нягледзячы на тое, што я нарадзіўся ў Калінінградзе і мая сям'я цалкам з Калінінграда аж да бабуль і дзядуль, я значную частку жыцця пражыў у Вілейцы. Каму, як не мне, разумець тых, хто жыве ў такіх жа мястэчках? Калі прыязджаю ў любы маленькі беларускі горад, мне здаецца, пра яго жыццё я ведаю больш, чым пра сваё.

— Над чым цяпер працуеш і якія творчыя задумкі маеш?

— Зараз трохі стаміўся ад тэкстаў і планую ўсе сілы кінуць на музыку. Калі кажу пра музыку, маю на ўвазе два гурты — Deproverst ды Travm. У адным я займаюся ўсім і запрашаю працаваць іншых музыкаў. У другім я іграю з вельмі таленавітымі хлопцамі на бас-гітары. Сам жанр Deproverst я вызначаю як no wave industrial. Што датычыца Travm, то гэта панк у самым шырокім сэнсе.

Марына ВЕСЯЛУХА.
vesialuha@zviazda.by

■ Кантрамарка

Беларуская драматургія: ШКЛЯНКА НАПАЛОВУ ПОЎНАЯ

«Гэта мая першая п'еса, дзе ніхто не памёр напрыканцы!» — аджартоўваецца падчас абмеркавання тэксту «Москаў Дрымін» драматург Віталь КАРАЛЁЎ. II Конкурс-фестываль сучаснай беларускай драматургіі WriteBox сапраўды выявіў змены ў драматургічным працэсе і абазначыў яго асноўныя тэндэнцыі.

Сучасная беларуская драматургія даўно стала брэндам постсавецкай прасторы. Без нашых імёнаў сёння не абыходзіцца, бадай, ніводзін шорт-ліст флагманскіх фестываляў ды конкурсаў — «Любімаўка», «Еўразія», «Рэмарка»... Аднак на радзіме аўтары п'ес адчуваюць адносную абдзеленасць увагай. Тэатразнаўца Вікторыя Белякова паспрабавала паўплываць на сітуацыю і стварыла ў беларускай тэатральнай прасторы яшчэ адзін пункт фокусу ўвагі на айчынных п'есах — Конкурс-фестываль сучаснай беларускай драматургіі WriteBox. Сёлета фестываль прайшоў другі раз. Пра цікавасць да яго сведчыць колькасць дасланых п'ес. У трох намінацыях («Новая п'еса», «Вяртанне», «Тутэйшыя») за права трапіць у шорт-ліст ды праграму чытак WriteBox змагаліся 42 п'есы. З 18 па 21 мая ў тэатральнай зале Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў прачыталі дзясятку найлепшых.

Магістральнай тэмай сёлетняга фестывалю стала эміграцыя. Перад значнай колькасцю дзеючых асоб паўставалі пытанні: ці там я жыву, дзе трэба, мо ў іншым месцы будзе лепш? Пошукі адказаў вымушалі з'язджаць і вяртацца. Герой п'есы Віталя Каралёва «Москаў Дрымін» Вадзім выпраўляецца ў Маскву працаваць экскурсаводам, але вяртаецца ў Мінск і дасягае ўсяго, чаго хоча, тут. Бо ўпэўніваецца: геаграфічнае становішча не так ужо моцна ўплывае на поспех і самарэалізацыю. У п'есе Андрэя Іванова «З вучылішча» («С училища») выкладчык філасофіі ў ПТВ Сярожа так марыць зарабіць грошай і з'ехаць падалей ад «біямасы», якая яго атуляе, што б'ецца аб заклад: пазбавіць цнатлівасці адну са сваіх навучэнак. Максім Дасько сягае ў будучыню і ператварае Беларусь у загадкавую тэрыторыю Лаброум, куды вяртаецца Крыстаф Раўх, а ў мінулым Леанід Шаблоўскі...

Сёлетні конкурс зрабіў больш заўважнымі і драматургічныя пошукі формы. Той жа «Лаброум» Максіма Дасько кідае выклік рэжысёрам сваім аб'ёмам — крыху менш за 200 вордаўскіх старонак. А яшчэ фантастычнай умоўнасцю і спалучэннем дыялогаў, дзённіка і візуальнага шэрагу з фотаздымкаў. Аляксей Макейчык стварыў сваю п'есу «Галасы» з шасці маналогаў. Выбраная форма прымусіла журы паспрачацца: ці стае п'есе цэласнасці, завершанасці і ці не зашмат прасторы пакідае драматург рэжысёру.

Яшчэ адной заўважнай тэндэнцыяй стала пазітыўнае мысленне, не ўласцівае новай драме нулявых. Напрыклад, драматургі менш канцэнтруюцца на маргінальных героях і прадстаўляюць іх гледачу ў іншым ракурсе. Гісторыя мігрантаў — гэта ўжо не слынная «Вайна малдаван за кардонную каробку» — спектакль маскоўскага «Театра.doc» паводле п'есы расійскага драматурга Аляксандра Радзівонава. Дакументальная гісторыя Вольгі Прусак, якая і стала асновай п'есы «Сіртакі», у пэўнай ступені бесканфліктная ды зіхаціць мультынацыяналізмам, як фантан «Сяброўства народаў» на ВДНГ у сонечны дзень. «Сіртакі» дазваляе пабачыць свет вачыма дзяўчыны, што працуе роставай лялькай у маскоўскім рэстаране ў акружэнні прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў. Ці, напрыклад, маналогі-псеўдавербацімы Аляксея Макейчыка. Востарасацыяльнасць сыходзіць у п'есе «Галасы» на другі план, драматург найперш выяўляе экзістэнцыяльныя перажыванні герояў. Шэсць маналогаў яднае агульны канцэпт — кожны з іх прысвечаны базаваму чалавечаму пачуццю: слых, абанянне і г. д. Аднак гісторыі пра нявестку-вегетарыянку, што паказвае дзеду адфаташопленае фота ўнучкі з зоркамі на вачах (каб не сурочылі), ці пра мужчыну, які быў зняволены за забойства прыяцеля, што абразіў яго жонку, а пасля турмы завёў палюбоўніцу, — гэта яшчэ і гісторыі пра пекла перфекцыяніста, тыя дробязі і акалічнасці жыцця, якія не дазваляюць адчуваць сябе шчаслівым. Пяць такіх гісторый, а потым кантрапунктам шостая пра чалавека, які знайшоў ласіныя рогі і не знайшоў перашкод для шчасця.

Фота Ігара ЧЫШЧЭНІ.

Адна з галоўных мэт падобных фестываляў — зацікавіць прафесійную публіку новымі тэкстамі. Але прафесійных лаўцоў тэкстаў (рэжысёраў, прадзюсараў, менеджараў), што шукаюць новую п'есу для пастаноўкі, у зале можна было пералічыць на пальцах. Дый пэўная ізаляванасць — праблема не выключна фестывалю WriteBox, а ўсёй беларускай тэатральнай прасторы. З іншай задачай, тэарэтычнай, WriteBox справіўся больш паспяхова: праграма чытак дазволіла асэнсаваць становішча сучаснай драматургіі адносна агульнамастацкіх каардынат. Такім чынам, мы па-ранейшаму застаёмся ў рэчышчы постдакументалізму, які сцвярджае самы розны сінтэз мастацкага і рэальнага ў творах. Але востарасацыяльнасць паступова змяняюць экзістэнцыяльныя праблемы. І нашае жыццё ўсё часцей паўстае ў п'есах куды больш пазітыўным, чым колькі гадоў таму.

Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ

«РУЖАНСКАЯ БРАМА» ЗНОЎ СКЛІКАЕ ГАСЦЕЙ

Сёння ў Ружанах праходзіць пяты па ліку фестываль у гонар галоўнай мясцовай славутасці. Правядзенне маштабнага свята стала магчымым пасля рэстаўрацыі часткі велічнага палаца роду Сапегаў, які яшчэ ў даўнія часы заслужана параўноўвалі з Версалем.

ЗАНЯПАД І АДРАДЖЭННЕ

